Пралетары! Усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выдання.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 218 (2707) Аўторак, 24-га верасьня 1929 г.

КОШТ НУМАРУ 5 коп.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 475. Рэдактара—№ 159.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к., мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпальтовага пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шпальтовага наперад тэксту 1 р. — к. За радок шпальтовага перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожэй. Зьмяшчэньне бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 к. За кожны дадатковы — 15 к. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб. радок.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддаленых Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

154 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13, государ-стен. публичн. библиотека. стулз. сьнст. адзін экз.

На шырокае абгаварэньне савецкай грамадзкасьці.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР

па праэкту асноўных палажэньняў пра арганізацыю сельскіх саветаў у Саюзе ССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пастанаўляе:

1. Праэкт асноўных палажэньняў аб арганізацыі сельскіх саветаў у Саюзе ССР прыняць за аснову і апублікаваць у „Известиях ЦИК Союза ССР и ВЦИК".

2. З прычыны асаблівай важнасьці асноўных палажэньняў аб арганізацыі сельскіх саветаў у Саюзе ССР і неабходнасьці падрабязнага азнаямленьня з праэктам гэтага закону шырокіх рабочых і селянскіх мас і ўсяго актыву савецкіх і грамадзкіх арганізацый, перадаць яго праз цэнтральныя выканаўчыя камітэты саюзных рэспублік на папярэдняе абгаварэньне працоўных у мясцовых саветах і савецкіх грамадзкіх арганізацыях.

3. Запрапанаваць цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік забясьпечыць самае шырокае абгаварэньне праэкту асноўных палажэньняў з тым, каб усе прапановы і заўвагі савецкіх і грамадзкіх арганізацый, а таксама пасобных асоб былі пададзены ў Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР да 15 лістапада 1929 году.

4. Пытаньне аб канчатковым зацьверджаньні закону—„Асноўныя палажэньні аб арганізацыі сельскіх саветаў у Саюзе ССР"—уключыць у парадак дню II-й Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР 5-га скліканьня.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР Г. Мусабекаў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР А. Енукідзе.

Масква, Крэмль, 11 верасьня 1929 г.

Праэкт асноўных палажэньняў аб арганізацыі сельсаветаў у СССР

У мэтах разьвіцьця дзейнасьці сельскіх саветаў у справе сацыялістычнай перабудовы краіны, забясьпечаньне „за імі сапраўднага кіраўніцтва гаспадарчым палітычным і культурным жыцьцём вёскі, узмацненьня работы сельскіх саветаў па ўцягненьні працоўных у дзяржаўнае будаўніцтва і кіраўніцтва, падняцьня палітычнай актыўнасьці батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас для наступу на капіталістычныя элемэнты вёскі, а таксама ў інтарэсах унясеньня аднастайнасьці ў арганізацыйную пабудову сельсаветаў, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР прапануе цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік правесьці ў жыцьцё арганізацыю сельскіх саветаў на міжэйпаказаных падставах:

1. АРГАНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ.

1. Сельскія саветы ўтвараюцца ва ўсіх паселішчах, прычым дробныя паселішчы могуць аб'ядняцца адным сельсаветам. Аб'яднаньне паселішчаў, якія налічваюць 300 і больш жыхароў, а таксама ўтварэньне сельсаветаў у паселішчах, якія налічваюць менш 300 жыхароў, дазваляецца ў парадку, устанаўляемым законадаўствам саюзных рэспублік у адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі і вучотам нацыянальнага складу насельніцтва.

2. Парадак выбараў у сельскія саветы ўстанаўляецца цэнтральнымі выканаўчымі камітэтамі саюзных рэспублік у адпаведнасьці з асноўнымі палажэньнямі, якія выдаюцца Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам Саюзу ССР.

3. Сельскія саветы выбіраюцца на тэрміны, устаноўленыя для перавыбараў адпаведных раённых і ім роўных выканаўчых камітэтаў. Датэрміновае пераабраньне сельскіх саветаў вытвараецца па пастанове цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік.

4. Выбаршчыкі розных пластоў працоўнага насельніцтва ўдзельнічаюць у выбарах дэпутатаў у сельскія саветы па адноўлькавай, устаноўленай, згодна Канстытуцыі, норме.

5. Выбаршчыкі маюць права адкліканьня у кожны час выбраных імі і не апраўдаўшых іх давер'я дэпутатаў. Месца адкліканага дэпутата займае кандыдат, а ў выпадку адсутнасьці кандыдата вытвараюцца дапыбары.

6. Для выкананьня рашэньняў сельскага савету і вядзеньня бягучай работы сельскім саветам з ліку яго членаў выбіраюцца старшыня і сакратар, прычым апошні можа быць выбраны і ня з складу членаў савету. У сельскіх саветах, якія яднаюць значную колькасьць насельніцтва, могуць быць выбраны ў адпаведнасьці з законадаўствам саюзных рэспублік, прэзыдыумы.

7. Для ажыцьцяўленьня кантролю за фінансава-гаспадарчай дзейнасьцю сельскага савету адначасова з выбарамі сельскага савету і на той-жа тэрмін паўнамоцтваў выбіраюцца, згодна законадаўству саюзных рэспублік, рэвізійныя камісіі.

2. ПРАДМЕТЫ ВЕДАНЬНЯ СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ.

8. Сельскі савет зьяўляецца вышэйшым органам улады на падпарадкаванай яму тэрыторыі, які яднае працоўнае насельніцтва для ўдзелу ў цэнтральным і мясцовым дзяржаўным кіраваньні, гаспадарчым і сацыяльна-культурным будаўніцтве. Сельскія саветы вырашаюць пытаньні сельскага значэньня і абмяркоўваюць пытаньні раённага, акруговага, абласнога, краявога, рэспубліканскага і агульнасаюзнага значэньня.

9. Сельскія саветы абіраюць дэлегатаў на раённыя зьезды саветаў па нормах і ў парадку, які ўстанаўляецца законадаўствам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР і цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік.

10. Сельсаветы арганізуюць і кіруюць дзейнасьцю ўсіх прадпрыёмстваў і ўстаноў сельскага значэньня і маюць права кантролю над знаходзячымися на іх тэрыторыі непадпарадкаванымі ім дзяржаўнымі і каапэрацыйнымі ўстановамі і прадпрыёмствамі бяз умешваньня ў іх апэрацыйную дзейнасьць.

11. Сельскія саветы ўзгадняюць плян работ каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый, накіроўваючы іх дзейнасьць у бок сацыялістычнай перабудовы вёскі.

12. Сельскія саветы аказваюць усялякае садзейнічаньне дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям у справе хлебных і сыр'явых загатовак, арганізуюць бядняцка-серадняцкія масы вёскі для ўзьдзейнічаньня на капіталістычныя (кулацкія) элемэнты, якія ўтойваюць і не даюць хлеба і сыравіны, вядуць барацьбу з супроцьдзеяньнем мерапрыёмствам савецкай улады ў галіне загатовак.

13. Сельскія саветы кіруюць дзейнасьцю сялянскіх арганізацый узаемадапамогі і непасрэдна выконваюць працу па правядзеньні ў жыцьцё законаў аб сацыяльным забясьпечаньні застарэлых бяднейшых сялян і сялянак.

14. Сельскія саветы наглядаюць за выкананьнем на падпарадкаванай ім тэрыторыі ўсімі грамадзянымі і службовымі асобамі законаў і распараджэньняў савецкай улады.

15. У сельскіх саветах у парадку і ў тэрміны, якія ўстанаўляюцца законадаўствам саюзных рэспублік, утвараюцца самастойныя бюджэты.

16. За бюджэтамі сельскіх саветаў замацоўваюцца:

а) мясцовыя непадатковыя даходы ад маёмасьці і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі і маюць выключнае альбо пераважна сельскае значэньне, у тым ліку прыбыткі зямельных фондаў і рознага роду прадпрыемства, перадаваемых сельсаветам зямельнымі таварыствамі, на падставе арт. 52 асноўных палажэньняў аб землякарыстаньні і земляўпарадкаваньні;

б) адлічэньні ад адзінага сельскагаспадарчага падатку і іншых дзяржаўных крыніц;

в) надбаўкі да дзяржаўных крыніц па прамысловаму і падаходнаму падаткам;

г) мясцовыя падаткі і зборы, якія бяруцца на тэрыторыі сельскага савету, поўнасьцю альбо ў разьмерах, устанаўляемых вышэйстаячымі савецкімі органамі.

У бюджэты сельсаветаў па прыбытках і выдатках павінны быць уключаны сродкі, якія атрымліваюцца па самаабкладаньні, па фондах лясоў мясцовага значэньня і г. д.

Цэнтральныя выканаўчыя камітэты саюзных рэспублік павінны даць паказаньні аб пераглядзе сьпісаў прадпрыемстваў, пабудоў, зямельнай і да гэтата падобнай маёмасьці, што знаходзіцца ў веданьні выканаўчых камітэтаў і зямельных таварыстваў, у бок пашырэньня маёмаснай базы сельскіх саветаў.

17. У галіне падатковай сельскія саветы падлічваюць крыніцы падатковага абкладаньня і робяць узысканьне падаткаў і зборaў.

18. У мэтах разьвіцьця гаспадарчага і культурнага будаўніцтва вёскі сельскія саветы арганізуюць сельскую грамадзкасьць для правядзеньня самаабкладаньня на мясцовыя патрэбы з захаваньнем клясавага прынцыпу. На падставе законадаўства Саюзу ССР і саюзных рэспублік сельскія саветы праводзяць збор і выдаткаваньне сродкаў па самаабкладаньні.

19. У галіне сельскай гаспадаркі сельскія саветы арганізуюць батрацкія і бядняцка-серадняцкія масы сялянства для сацыялістычнай перабудовы вёскі.

У гэтых мэтах сельскія саветы:

а) арганізуюць і прымаюць меры да разьвіцьця калектыўных і савецкіх гаспадарак, сельскагаспадарчых і каапэрацыйных таварыстваў і іншых форм аграмаджаньня сельскай заспадаркі;

б) усямерна садзейнічаюць калектывізацыі цэлых паселішчаў і ўзбуйненьню існуючых калгасаў і вядуць барацьбу з супроцьдзеяньнем капіталістычных элемэнтаў вёскі росту калектывізацыі.

в) прымаюць меры адносна бядняцка-серадняцкіх індывідуальных гаспадарак і калектываў для хутчэйшага ўздыму ўраджайнасьці, пашырэньня пасеўных плошчаў, разьвіцьця тэхнічных культур і жывёлагадоўлі, па барацьбе са шкоднікамі і засухай і па ліквідацыі агранамічнай няпісьменнасьці сярод насельніцтва;

г) прымаюць меры да правядзеньня земляўпарадкаваньня, мэліярацыі, палепшаньня воднай гаспадаркі, а таксама да арганізацыі прадпрыёмстваў для перапрацоўкі прадуктаў сельскай гаспадаркі;

д) арганізуюць і ўдзельнічаюць у арганізацыі машынных таварыстваў, пракатных, злучных, зерноачышчальных, вэтэрынарных і іншых пунтаў і рамотных майстэрняў;

е) наглядаюць за трыманьнем у спраўнасьці арасільнай сеткі і своечасовым выкананьнем вадакарыстальнікамі ўсіх прадугледжаных існуючым законадаўствам абавязацельстваў як у а адносінах трыманьня водных пабудоў, так і ў адносіне захаваньня ўзроўню вады.

Ва ўсіх мерапрыемствах па ўздыму і перабудове сельскай гаспадаркі сельскія саветы аказваюць усямерную дапамогу беднаце, уцягваючы яе ў першую чаргу ў каапэрацыю і калгасы, і аказваюць дапамогу ўздыму гаспадарак маламоцных пластоў сялянства.

20. У мэтах узмацненьня нацыяналізацыі зямлі і забясьпечаньня правядзеньня ў жыцьцё законаў аб землякарыстаньні і земляўпарадкаваньні сельскія саветы наглядаюць за законным выкарыстаньнем зямельных вучасткаў, вядуць барацьбу з закабаленьнем сельскай беднаты капіталістычнымі элемэнтамі вёскі, скрытай арэндай і іншымі парушэньнямі закону аб нацыяналізацыі зямлі, а таксама рэгіструюць усякага роду дагаворы аб згодзе паміж пасобнымі грамадзянамі аб землякарыстаньні альбо адмаўляюць у іх рэгістрацыі.

21. Сельскія саветы кіруюць усёй дзейнасьцю зямельных таварыстваў, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі, і маюць права скасаваньня і зацьверджаньня пастаноў зямельных таварыстваў.

Усямерна забясьпечваючы кіруючую ролю ў зямельных таварыствах за батрацкімі і бядняцка-серадняцкімі элемэнтамі вёскі, сельскія саветы наглядаюць за тым, каб капіталістычныя (кулацкія) элемэнты вёскі не аказвалі ўплыву на справы зямельных таварыстваў і не карысталіся правам рашучага голасу на сходах членаў зямельных таварыстваў.

22. Удзел сельскіх саветаў у разглядзе і вырашэньні зямельных спрэчак вызначаецца законадаўствам Саюзу ССР і саюзных рэспублік.

23. У галіне лясной гаспадаркі сельскія саветы загадваюць лясамі мясцовага значэньня, робяць новыя лясныя насаджэньні і ўмацаваньне пяскоў, а таксама прымаюць удзел у ахове лясоў і лесанасаджэньняў агульнадзяржаўнага значэньня.

24. Сельскія саветы наглядаюць за выкананьнем дзяржаўнымі, грамадзкімі ўстановамі і арганізацыямі законаў і правіл аб ахове працы, заработнай плаце, а таксама калектыўных і працоўных дагаворах і да р[illegible]мерапрыёмств, якія праводзяцца цэнтральнай уладай у галіне працы, і арганізуюць абарону батракоў і бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі, а таксама ў галіне ліквідацыі іх капіталістычнымі элемэнтамі вёскі.

Пры выяўленьні парушэньня законаў аб працы сельсаветы прыцягваюць вінаватых да адказнасьці.

25. У мэтах замацаваньня абароназдольнасьці краіны сельскія саветы садзейнічаюць адпаведным арганізацыям у правядзеньні мерапрыёмстваў па ваенізацыі насельніцтва, распаўсюджваньні вайсковых ведаў, дапрызыўнай падрыхтоўцы, тэрытарыяльных зборaў, клясавага адбору прызываемых у Чырвоную армію і інш.

26. Сельскія саветы арганізуюць працоўных для правядзеньня ліквідацыі няпісьменнасьці і прымаюць меры да сапраўднага ахопу школай дзяцей батрацтва і бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі, а таксама да разьвіцьця сеткі культурна-асьветных і мэдыка-санітарных устаноў.

Сельскія саветы праводзяць мерапрыёмствы, накіраваныя да падвышэньня палітычнага ўзроўню працоўных і да разьвіцьця жанчын, і вядуць барацьбу з бытавымі перажыткамі.

27. Сельскія саветы праводзяць работу ў галіне дабрабыту вёскі і палепшаньня дарожнага будаўніцтва і ў сувязі на падставе законадаўства саюзных рэспублік.

28. Сельскія саветы карыстаюцца правамі юрыдычнае асобы ў разьмерах, якія ўстанаўляюцца законадаўствам саюзных рэспублік. Пастановамі цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік пасобным сельскім саветам можа быць дадзена права выданьня абавязковых пастаноў.

3. ЗАЛУЧЭНЬНЕ ПРАЦОЎНЫХ У РАБОТУ САВЕТАЎ.

29. У мэтах ажыўленьня дзейнасьці саветаў і шырокага залучэньня ў іх практычную работу батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі пры сельскіх саветах арганізуюцца сэкцыі, прычым работа с.-г. сэкцый павінна будавацца па тыпу вытворчых нарад.

30. Сельскія саветы рэгулярна склікаюць агульныя сходы выбаршчыкаў, намячаюць пытаньні, якія ставяцца на абгаварэньне гэтых сходаў, падрыхтоўваюць дакладчыкаў і г. д. Агульныя сходы склікаюцца: а) па выбарчых вучастках; б) па пасобных паселішчах, якія яднаюцца сельскім саветам; в) усіх паселішчаў, якія аб'яднаюць сельскія саветы.

Асобы, пазбаўленыя выбарчага права, на агульныя сходы не дапушчаюцца.

31. Агульныя сходы адчыняюцца ад імя сельскага савету яго старшынёй альбо ўпаўнаважаным на гэта членам сельскага савету, а для кіраўніцтва сходам абіраецца прэзыдыум.

32. Пастановы агульных сходаў праводзяцца ў жыцьцё сельскім саветам. У тых выпадках, калі сельскі савет знаходзіць пастанову агульнага сходу незаконнай альбо німэтазгоднай, ён прыпыняе выкананьне памянёнай пастановы і заразжа паведамляе аб гэтым раённаму выканаўчаму камітэту, які і вырашае ўзьнікшыя рознагалосьсі.

33. Сельскія саветы садзейнічаюць работе груп беднаты і ставяць да іх абгаварэньне ўсе важнейшыя пытаньні работы саветаў.

34. Сельскія саветы і члены сельскіх саветаў даюць справаздачы сваім выбаршчыкам не радзей трох раз у год.

* * *

АД РЭДАКЦЫІ. У заўтрашнім нумары будзе зьмешчан артыкул т. Енукідзэ па гэтаму пытаньню.

Рух супроць Чан-Кай-Шы.

„Аб'яднаны" Кітай напярэдадні новых генэральскіх боек.

Паўстаньне супроць Чан-Кай-шы

ШАНХАЙ, 23-IX. Паведамленьне аб паўстаньні Чан-Фа-Гуя супроць Чан-Кай-шы пацьвярджаецца. Армія, якая знаходзілася ў Учане, атрымаўшы загад перасунуцца ў райён Лунгайскай чыгункі, адмовілася скарыцца і пайшла не ў правінцыю Хунань, а ў правінцыю Хунань. Чан-Фа-Гуй апублікаваў адозву супроць Нанкіну, падпісаную многімі ваеннымі дзеячамі.

ГЕНЭРАЛЫ РЫХТУЮЦЦА ДА БОЮ.

БЭРЛІН, 22-9. Шанхайскі карэспандэнт „Берлінэр Тагэблят" паведамляе, што ў Кітаі завязваецца новая грамадзянская барацьба. Пачаткам новай унутранай барацьбы карэспандэнт лічыць выступленьне генэрала Чан-Фа-Гуя, які разам з сваёй жалезнай дывізіяй спрабуе прадзьці на поўдзень праз правінцыю Хунань, каб заняць супольна з гуансійцамі Кантон і выгнаць адтуль прыхільнікаў нанкінскага ўраду.

Водлуг вестак карэспандэнта, у Кантоне міркуецца агаласіць новы гоміндаўскі ўрад, прычым гаміндаўцы, якія прызначаюцца на міністэрскія пасады, ужо выехалі ў Гонконг. Далей карэспандэнт паведамляе, што Фын-Юй-Сян амаль штодзень заяўляе аб сваёй гатоўнасьці выехаць за межы.

„АДХІЛЯЮЦЬ" ВЕСТКІ АБ АРЫШТАХ.

ШАНХАЙ, 22-IX. Кітайскія газэты адхіляюць сьцьвярджэньні японскіх крыніц аб шматлікіх арыштах сярод слухачоў кадэцкага вайсковага корпусу ў Нанкіне і аб катаваньнях шэрагу слухачоў за ўдзел у руху супроць ураду. Гавораць таксама, што ў Нанкіне арыштаваны генэрал Ган-Шэн-Чы

Дэманстрацыя супроць Чан-Кай-Шы

ШАНХАЙ, 22-9. Як паведамляе друк, на тэрыторыі францускай канцэсіі адбылася дэманстрацыя рабочых супроць Нанкіна, Чан-Кай-Шы і Гаміндана. Дэманстранты распаўсюджвалі лістоўкі у якіх нанкінскі ўрад абвінавачваецца ў супрацоўніцтве з замежнымі імпэрыялістамі.

Патрабуюць зьмены.

ТОКІЁ, 22-IX. Цыркулярная адозва начальніка 4 дывізіі генэрала Чжан-Фа-Гуя, падпісаная некаторымі генэраламі гуансійскай і фынюнсянскай груповак, абвінавачваюць міністра грашовых спраў у злоўжываньнях вайсковымі пазыкамі і заяўляюць, што нанкінскі ўрад зусім ня здатны дабіцца скасаваньня няроўных дагавораў. Адозва заканчваецца патрабаваньнем адстаўкі Чан-Кай-Шы і перадачы ўлады Ван-Цзін-Вэю.

НЯМЕЧЧЫНА І АНТЫСАВЕЦКІ БЛЁК

„Супрацоўніні" антысавецкага блёку.

БЭРЛІН, 21-IX. Выкрыцьцё „Нацыянал Лібэраль Карэспандэнт", мэтай якога было адкідаць контр-урадам на кампанію нацыяналістаў супроць пляну Юнга, зрабіла, аднак, удар па ўсяму асінаваму гняздзу і выкрыла шмат заяў асоб, якія прыймалі ўдзел у гэтай справе.—Гэтыя заявы кідаюць сьвятло на становішча анты-савецкай кампаніі прамысловай групоўкі, прадстаўніком якой зьяўляецца Рэхбэр, а таксама некаторыя нацыялістычныя колы.

Орган „Млада Нямецкага Ордэну" агалошвае новыя выкрыцьці, згодна якіх „стальны шлем" і вядомы прамысловец, гаспадар газэтнага трэсту Ўбэнбэрг вялі перамовы з францускім дэпутатам Рэно аб ўмовах франка-нямецкага супрацоўніцтва. У перамовах у Парыжы прымаў удзел генэрал Кондэр Ліпэ. Кондэр Ліпэ і Рэхбэр агаласілі заяву, у якой не адмаўляюць, што яны вялі перамовы ў Англіі і Францыі, але яны зазначаюць, што яны інфармавалі аб сваіх перамовах нямецкага пасла ў Парыжы фон-Гёша.

* * *

БЭРЛІН, 21-IX. З водгукаў друку на выкрыцьцё „Нацыянал-Лібэраль" (бюлетэнь народнай партыі, які лічыцца рупарам Штрэзэмана) высьвятляюцца некаторыя новыя падрабязнасьці перамоваў аб ваенным саюзе і ўтварэньні агульнага фронту супроць СССР, які вёў у Англіі і Францыі нацыяналістычны дэпутат рэйстагу Клейнэ у часе паездкі туды ў 1926 годзе.

Водлуг паведамленьня газэт, Клейнэ прапанаваў французам вайсковы саюз на наступных умовах: „эвакуацыя Рэйнскай вобласьці, зварот Саарскай вобласьці, адмова ад вэрсій, што вінаватай у вайне зьяўляецца Нямеччына, і некаторае павялічэньне нямецкай арміі.

Няўдача перамоваў Клейнэ тлумачыцца відаць, тым, што ён ня здолеў дамагчыся згоды францыі на гэтыя патрабаваньні.

Ьязумоўны зварот Данцыгскага карыдору.

БЭРЛІН, 21-9. Дэпутат нацыянальнага блёку Клейнэн апублікаваў заяву з прычыны выкрыцьця „Нацыянальнага Лібэралом Карэспандэнт" аб яго перамовах з Англіяй і Францыяй. Клейнэн заяўляе, што ён вёў перамовы з кіруючымі палітычнымі дзеячамі ў Англіі ня ў 1926 годзе, а ў 1927 годзе. Выступаючы, як прыватная асоба, ён водлуг яго слоў катэгарычна заяўляў у Лёндане, што для Нямеччыны справа аб франка-англа-нямецкім супрацоўніцтве стане магчымай толькі тады, калі прынамсі будуць выкананы самыя элемэнтарныя патрабаваньні Нямеччыны. Ён паміж іншым патрабаваў бязумоўнага звароту Нямеччыне Данцыгскага карыдору і перагляду пляну Дауэса, з тым, каб Нямеччына ні пры якіх абставінах не павінна была плаціць больш паловы тэй сумы, якая прадугледжвалася гэтым плянам.

Клейнэн прызнае, што ўзімку 1927-1928 г. ён вёў перамовы ў Бэрліне з адным францускім палітычным дзеячом. З другога боку, у часе спробы перамоў аб пляне Юнга да Клейна прыходзілі некаторыя францускія палітыкі, з якімі ён гутарыў аб пляне Юнга. Аб гэтых гутарках Клейнэн заразжа паведамляў міністэрства замежных спраў.

ПАДРЫХТОЎКА НОВЫХ КАДРАЎ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ.

Учора ў памяшканьні ЦДС адбылася вялікая нарада спэцыялістаў. На гэтай нарадзе разглядалася пытаньне аб падрыхтоўцы новых кадраў спэцыялістаў у сувязі з рэканструкцыяй сельскае гаспадаркі. На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі Наркамасьветы Наркамзему і іншыя. Нарада цягнулася да 12 гадзін. ночы.

Падрабязны матар'ял будзе зьмешчаны ў наступным нумары.

Польскія надзеі ў сувязі з крызісам літоўскага ўраду

ВАРШАВА. Крызіс літоўскага ўраду прыцягнуў да сябе ўвагу польскіх палітычных колаў. Першыя весткі аб крызісе былі пададзены ў прэсе, як канчатковы адыход ад Вольдэмараса і як зваротны цунк у літоўскай замежнай палітыцы. Газэты падкрэсьліваюць што Тубяліс, якому даручана фармаваньне новага габінэту, зьяўляецца супраціўніком Вольдэмараса і прыхільнікам польска-літоўскага зьбліжэньня. Сёньняшняя прэса, асабліва вячэрняя, зьмяшчае супярэчныя весткі, якія нібы паходзяць з Рыгі і Бэрліну, прэса ўжо больш стрымана ацэньвае вынікі літоўскага ўрадавага крызісу. Стрыманасьць ацэнкі прэсы вельмі сур'ёзна зьвязана з тым, што кіруючыя польскія колы ягачэ ня маюць пэўнай арыентыроўкі і лічаць вельмі, магчымым, што Вольдэмарас увойдзе ў склад новага ўраду. Пры ўсіх адпак варунках польскія ўрадавыя колы ацэньваюць літоўскі ўрадавы крызіс, як вельмі спрыяючы момант, які ўзмацняе шансы палітычнай працы, якая вядзецца Польшчай у адносінах Літвы.

Між іншым, зьмяшчаючы паведамленьне аб магчымым назначэньні на пост прэм'ера кандыдатуры былога вайсковага міністра генэрала Даўкантаса, газэта падкрэсьлівае, што Даўкантас зьяўляецца праціўнікам дабрасуседзкай палітыкі Вольдэмараса адносна СССР.

Ці варта падкрэсьліваць, што ўсялякі добры зварот у польска-літоўскіх адносінах меў-бы вялікае значэньне і дзеля ўскладненага ўнутранага становішча Польшчы. Як-бы то ні было пытаньне аб Літве зноў высоўваецца на першы плян. Поле дзеяньня Польшчы, якое было абмежавана да гэтай пары досыць вузкімі спэцыяльнымі заданьнямі, значна пашыраецца.

У інфармацыйнай частцы польскія газэты аднадушна адзначаюць, што ёсьць весткі аб тым, што ў адстаўцы Вольдэмараса адыгралі значную ролю пытаньні замежнай палітыкі, асабліва нездаволенасьць вельмі яскравай савецкай арыентацыяй Вольдэмараса у Жэнэве. Побач з гэтым газэты ўзмоцнена распаўсюджваюць чуткі, якія ідуць нібы з літоўскіх сацыял-дэмакратычных колаў, што моцны ўплыў зрабіла таксама выкрыцьцё дзейнасьці Вольдэмараса, „які арганізаваў замах Плечкайтыса".

Выбары выканаўчага камітэту унітарнай канфэдэрацыі працы.

ПАРЫЖ, 21-IX. Зьезд унітарнай канфэдэрацыі працы заслухаў шэраг прывітальных тэлеграм ад прафсаюзных арганізацый. Зьезд прыняў зварот да Прафінтэрну, які гаворыць: «Унітарная канфэдэрацыя працы застаецца непарыўна зьвязанай з Чырвоным Інтэрнацыяналам прафсаюзаў, пад кіраўніцтвам якога яна будзе весьці барацьбу супроць капіталістычнай рацыяналізацыі і імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР. Пад кіраўніцтвам Камінтэрну канфэрэнцыя ўдасканаліць спосабы барацьбы і адаб'е вылазкі прадпрыёмцаў, ураду і сацыялістаў. Пад кіраўніцтвам Прафінтэрну ўнітарная канфэдэрацыя падрыхтуе рабочых да ўстанаўленьня дыктатуры пралетарыяту».

Пасьля зьезд прыступае да абраньня выканаўчага камітэту ўнітарнай канфэдэрацыі працы. Агалошваецца сьпіс кандыдатаў. Наперакор натуганм апазіцыі зьезд прымае кандыдацкі сьпіс большасьці. Супроць галасуе 19 чалавек. Абраны: Маннусо, Ракамон, Жытон, Сэмар, Кост і інш. Ад меншасьці па тым-жа сьпісу прайшлі: Шамболан, Шумахэр, Шосэн і інш. Шосэн заяўляе, што фракцыя меншасьці, да якой ён належыць, ня будзе ўдзельнічаць у пасяджэньнях выканкому.

У бюро выканкому абраны: Маннусо, Ракамон, Жытон, Бію, Клаверы і адзін прадстаўнік меншасьці. У складзе пашыранага бюро адмовіліся ўвайсьці апазіцыянэры Шумахэр і Шосэн. Зьезд вацьверджаў прапанаваны склад бюро ўсімі галасамі супроць 2-х.

БАЛБАТНЯ АБ „РАЗБРОЕНЬНІ".

ЖЭНЕВА, 20-9. У трэцай камісіі Лігі Нацый (камісія па разброеньні) адбывалася абгаварэньне рэзалюцыі, унесенай Робэртам Сэсілем. За рэзалюцыю Сэсіля выступілі прадстаўнікі Нарвэгіі, Швэдыі, Даніі, Вэнгрыі, Аўстрыі і Канады. Супроць рэзалюцыі—дзяржавы, якія выяўляюць думку большасьці—Польшча, Югаславія і Румынія.

Нудная дыскусія некалькі ажыўляецца **выпадам польскага дэпутата супроць Нямеччыны.** Прадстаўнік Польшчы Сокаль заяўляе: „Канвэнцыя аб разброеньні, вядома, ня будзе адпавядаць радыкальным пажаданьням Бэрнсторфа, аднак будзе мець усе шансы быць зацьверджанай урадамі і парламантамі ў большасьці краін". Нямецкі дэлегат Бэрнсторг заяўляе ў адказ, што ён ніколі ня ўносіў у падрыхтоўчай камісіі па разброеньні радыкальных прапаноў

ПРАДСТАЎНІКАМ СССР НЕ ДАЛІ ДАЗВОЛУ.

ПАРЫЖ, 21-IX. У Швэйцарыі адбыўся міжнародны кангрэс незалежнай кінематаграфіі пры ўдзеле прадстаўнікоў Нямеччыны, Аўстрыі, Англіі, Іспаніі, Францыі, Галяндыі, Італіі, Злучаных Штатаў, Японіі і Швэйцарыі. Дэлегаты СССР, у тым ліку кінарэжысэр Эйзэнштэйн, былі пазбаўлены магчымасьці прыняць удзел у работах кангрэсу, з прычыны таго, што яе атрымалі ад швэйцарскага ўраду дазволу на прыезд.

МЭКСТОН ВЫКЛЮЧАН З ЛІГІ.

ЛЁНДАН, 20-IX. Ангельская сэкцыя Лігі барацьбы з імпэрыялізмам і каленіяльным прыгнечаньнем пастанавіла выключыць старшыню Лігі Мэкстона (член палаты абшчын, старшыня ангельскай незалежнай раб. партыі) з Лігі, з прычыны адмовы Мэкстона ажыцьцяўляць рашэньні выканкому Лігі. У заяве выканкому ангельскай сэкцыі Лігі аб выключэньні Мэкстона, паміж іншым, зазначаецца, што орган незалежнай рабочай партыі „Нью Лідэр" падтрымлівай імпэрыялістычную палітыку Макдональдаўскага ўраду ў Эгіпце і Палестыне, і што Мэкстон нават зрабіў спробы публічна змагацца супроць імпэрыялістычнай палітыкі.

У Мэкстона запыталі, ці апублікаваў ён у сваім органе „Нью Лідэр" сваю прысягу на Франкфурцкім кангрэсе Лігі змагацца супроць імпэрыялізму? Мэкстон адказаў—„не". Апроч гэтага, Мэкстон адмовіўся прыступіць на пасяджэньні выканкому Лігі.

БЫЦЬ НАПАГАТОВЕ.

УЛАН-БАТОР, 22-IX. Сход членаў мангольскіх прафсаюзаў Улан-Батора прыняў рэзалюцыю, якая зазначае на неабходнасьць рашучай барацьбы супроць небясьпекі і ў прыватнасьці супроць правакацыі зарваўшыхся кітайскіх мілітарыстаў, якіх падбухторваюць імпэрыялісты.

Пад рэвалюцыйны сьцяг.

ЛЁНДАН, 21-IX. Як паведамляюць аўстралійскія газэты, аўстралійскі саюз чыгуначнікаў, які аб'ядноўвае 60 тысяч рабочых, пастанавіў увайсьці ў склад Ціхаакіянскага сэкрэтарыяту прафсаюзаў.

КІТАЙСКАЯ АРМІЯ.

У Кітаі няма адзінай арміі. Там кожная ваенна-палітычная групоўка і нават асобныя буйныя генэралы маюць уласнае войска. Вайсковыя сілы Кітаю разьяднаны, як і сам Кітай. Колькасьць усіх армій у Кітаі ў сучасны момант дасягае паўтара мілёнаў чалавек.

Усе арміі Кітаю — наёмныя. Па свайму ўнутранаму парадку і стану арміі розных кіраўнікоў і генэралаў мала чым адрозьніваюцца адна ад другой.

Аднаёмімся з манчжурскімі войскамі Чжан-Сюэ-Ляна, як найбольш характэрнымі і буйнымі сіламі кітайскага мілітарызму.

Вайсковай павіннасьці, як у Манчжурыі, так і ўласна ў Кітаі няма. Асноўным спосабам камплектаваньня кітайскай арміі зьяўляецца вярбоўка. Вярбуе наёмнікаў штаб кожнай асобай часткі, у якой ёсьць некамплект радавога складу.

Тэрмін службы звычайна трохгадовы.

Асноўны кадр дабраахвотнікаў складаюць хунгузы (бандыты) і былыя салдаты. Звычайна яны ідуць у армію за „кубак рысу", з-за беднасьці. Зруйнаваньне, ажабрачаньне, голад у вялізарных сялянскіх райёнах — даюць арміі танных салдат.

Нездальнянючы і афіцэрскі склад кітайскай арміі. Апроч скончыўшых вайсковыя школы, афіцэрскі склад набіраецца: з салдат і ўнцер-афіцэраў, па пратэкцыі, з хунгузаў, якія купілі сабе чын, з афіцэраў, скончыўшых вуз'ы ў Японіі, і шляхам запрашэньня чужаземных афіц

ВЫНІКІ ВЕРАСЬНЁЎСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б.

За генэральную лінію партыі.

Не палохацца цяжкасьцяў, не адступаць перад імі, а перамагаць іх, браць з бою ўсё новыя і новыя пазыцыі.

ДАКЛАД ТАВ. ГАМАРНІКА НА СХОДЗЕ МЕНСКАГА ПАРТАКТЫВУ.

Таварышы! Пленум ЦК, які толькі што скончыўся, абмеркаваў асноўную групу пытаньняў, якія вызначаюць плян усёй вашай работы на 1929-30 г.

Пленум разглядзеў наступныя пытаньні: 1) Кантрольныя лічбы народнае гаспадаркі на 1929-30 г. 2) Вынікі і далейшыя задачы калгаснага і савгаснага будаўніцтва. 3) Сацыялістычнае спаборніцтва і якасныя паказальнікі прамысловасьці. 4) Стан сампрамкаапэрацыі і далейшыя задачы. 5) Папярэднія вынікі чысткі, рост і рэгуляваньне складу партыі.

З пяці пытаньняў парадку дня пленуму чатыры ахватваюць карэнныя, вузлавыя пытаньні гаспадарчага будаўніцтва, а пятае—гэта рашаючае пытаньне, пытаньне аб узмацненьні пралетарскай баяздольнасьці КП(б)Б, яшчэ большага згуртаваньня яе радоў, ачысткі радоў яе ад усяго чужога, забесьпячэньне выразнай ленінскай лініі ў рабоце ўсіх яе зьвеньняў.

Што паказаў мінулы гаспадарчы год.

На падставе вынікаў мінулага пэрыяду і пляновых разьлікаў на 1929-30 г. як па СССР, так і па БССР, мы маем усе даныя для таго, каб сьцьвярджаць, што: 1) пяцігодка народнае гаспадаркі як СССР, так і БССР ня толькі зусім рэальная, але ёсьць усе падставы для таго, каб перагледзець рад важнейшых элемэнтаў у бок павялічэньня, узмацненьня тэмпу. 2) Мы пасьпяхова разьвівалі і разьвіваем сацыялістычнае наступленьне на прыватна-капіталістычныя элемэнты, пасьпяхова вырываем карэньні капіталізму. Сацэктар вырас і перавысіў плянавыя намячэньні. 3) Наша сацнаступленьне выклікала і выклікае абвастрэньне клясавай барацьбы. У гэтай барацьбе за мінулы год яшчэ больш узмацнілася пралетарская дыктатура, узмацнела і паднялася на вышэйшую ступень змычка рабочае клясы з асноўнымі масамі працоўнага сялянства. Растуць і мацнеюць новыя вытворчыя формы змычкі. 4) Мы пасьпяхова перамагаем труднасьці, зьвязаныя з цяперашнім этапам нашага агульнага росту сацыялістычнай рэканструкцыі. Мы справіліся з затрудненьнямі на хлебным рынку, абыйшліся бяз увозу хлеба з-за мяжы і тым самым захавалі валюту для справы індустрыялізацыі краіны.

Мы дабіліся гэтага ўвядзеньнем нарманаванага водпуску хлеба, устанаўленьнем рэжыму эканоміі, абвяшчэньнем барацьбы маркатраўству, неэканомнаму выдаткаваньню хлеба, а таксама скарысталі ўсе сродкі, што меліся ў распараджэньні пралетарыяту, каб прымусіць кулака здаць хлеб пралетарскай дзяржаве. 5) Мы правільнай лініяй партыі выклікалі вялікі працоўны энтузіязм рабочае клясы, сялян-беднякоў і сераднякоў. Сацыялістычнае спаборніцтва ў горадзе і на вёсцы, ці індустрыялізацыі і калектывізацыі маглі каардаваць толькі ў атмасфэры поўнага падтрыманьня рабочай клясай і працоўным сялянствам правільнай лініі партыі. 6) Мы на справе пасьпяхова ажыцьцяўляем лёзунг Ільліча—дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны. Усе гэтыя вынікі зьяўляюцца мощным ударам па ўсіх антыленінскіх настроях бухарынцаў. Як мізэрна выглядаюць „Заметки экономиста" і іншыя бухарынскія „працы" апошняга часу перад тварам вынікаў мінулага году і пэрспэктыў будучага.

Бухарынцы змагаліся і змагаюцца супроць нашага напружанага тэмпу індустрыялізацыі, супроць нашага тэмпу калгаснага і савгаснага будаўніцтва, супроць пяцігодкі, цягнулі нас назад „раўнацца" на „вузкія месцы", прабавалі запалохаць фінансавымі і хлебнымі труднасьцямі. Бухарынцы прабавалі і прабуюць паслабіць наша наступленьне супроць кулака і нэпмана, прыкрываючы сваю абарону клясавага ворага антыленінскім рэвізіянісцкім тлумачэньнем пытаньня змычкі гораду і вёскі. Партыя рашуча адкінула ўсе бухарынскія рэцэпты і сьмела ішла па ленінскім шляху, наступаючы з усёй сілай на кулака, якому Бухарын з усіх сіл хоча дапамагчы „ўрасьці ў сацыялізм".

Дазвольце цяпер спыніць вашу ўвагу на радзе лічбовых паказальнікаў гаспадарчых вынікаў мінулага году па БССР, каб імі пацьвердзіць тыя агульныя вывады, якія мною спачатку зроблены. У сельскай гаспадарцы мы маем рост пасеўных плошчаў на 2 проц. Гэты рост, зразумела, не вялікі, але ўсё мы ведаем, што рост пасеўных плошчаў па БССР упіраецца ў малазямельле, зьвязаны з мэліярацыяй. Гэты рост пасеўных плошчаў і ў нас у БССР праходзіў ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы, калі кулак у парадку сабатажу, адпору пралетарскай дыктатуры скарачаў часта свае засевы, а бяднякота-серадняцкія масы перакрывалі гэта пашырэньнем сваіх плошчаў.

У наяўнасьці ў гэтым годзе паляпшэньне ўраджаю, узмацненьне агрыкультурных мерапрыемстваў, агульны вытворчы ўздым бяднякота-серадняцкіх мас. Значна ўзрос сацэктар у сельскай гаспадарцы. Кантрактацыяй ахоплена сёлета на 87,6 проц. больш гаспадарак, чым у 1927-28 г. Колькасьць каапэраваных сялянскіх гаспадарак вырасла на 127 проц. супроць 1927-28 г. У наяўнасьці рост калектывізацыі на 180 проц. супроць 1927-28 г. Калі ў мінулым годзе пад калектывамі было 1,2 проц. усёй плошчы, то ў гэтым годзе ўжо 3,2 проц. У выходзячым годзе калгасы разгортваюцца на плошчы да 200 тыс. гэктараў і калі ў мінулым годзе ў сярэднім на адзін калгас прыпадала 65 гэктараў, то ў гэтым годзе прыпадае ўжо 218 гэктараў. Сярэдні разьмер нашых калгасаў у цэлым радзе райёнаў вышэй за сярэдні па РСФСР. У гэтым годзе створаны калгасы па тысячы, дзьве, тры і чатыры тысячы гэктараў. Калектывізацыя ахватвае ўжо цэлыя сёлы і значную частку паасобных райёнаў, як, напрыклад, Клімавіцкі раён, Магілеўшчыны, у якім магутна разьвіваецца калектывізацыя. Калектыўны рух знаходзіць жывы водгук у шырокіх бяднякота-серадняцкіх масах. У дзень калектывізацыі ў нас па БССР арганізаваліся 103 калгасы на плошчы ў 30 тыс. гэктараў, з іх тры калгасы з плошчаю больш тысячы гэктараў кожны.

Такія агульныя вынікі разьвіцьця сельскае гаспадаркі за год. Але побач з радам посьпехаў у галіне ўздыму сельскае гаспадаркі, яе рэканструкцыі мы павінны завастрыць увагу ўсёй КП(б)Б на вузкім месцы ў сельскай гаспадарцы, на пытаньні аб жывёлагадоўлі. Мы маем у гэтым годзе скарачэньне жывёлагадоўлі. Гэта скарачэньне ў асноўным выклікана недахватам кармоў, што не дало магчымасьці бяднякота-серадняцкім масам сялянства перакрыць скарачэньне разьвіцьця жывёлагадоўлі з боку кулацкіх гаспадарак. Не малая доля віны ляжыць і на нас. Трэба прызнаць, што жывёлагадоўлі не аддаецца яшчэ тае ўвагі, якую яна заслугоўвае ва ўмовах Беларусі. Бюро ЦК нядаўна прыняло цэлы рад пастаноў, якія стымулююць разьвіцьцё жывёлагадоўлі, трэба каб гэтыя пастановы поўнасьцю былі праведзены ў жыцьцё.

Я пераходжу да пытаньня аб выніках работы нашай прамысловасьці. Мы ў гэтым годзе маем рост валавай прадукцыі па рэспубліканскай прамысловасьці на 45 проц. супроць росту ў 1927-28 г. на 37,9 проц. Як бачыце, ня толькі значны рост наогул, але і нарастаньне тэмпу прамысловага разьвіцьця Беларусі. Колькасьць рабочых буйной прамысловасьці вырасла ў гэтым годзе на 21,5 проц. Так, у краіне больш расьце прамысловасьць, расьце пралетарыят. Але адначасова з гэтым мы павінны канстатаваць невыкананьне запраэктаваных якасных паказальнікаў. Замест запраэктаваных 7 проц. зьніжэньня сабекошту прадукцыі, мы ў лепшым выпадку дабіліся зьніжэньня на 4,5 проц. Таксама трэба адначыць яшчэ дрэнную якасьць прадукцыі, а ў радзе выпадкаў і пагоршаньне. Разгорнутае ў апошнія месяцы сапспаборніцтва ўзьняло якасныя паказальнікі. Але сацспаборніцтва яшчэ ня досыць ахоплена кіраўніцтвам партыйных прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый. Яшчэ вельмі часта ўсе гэтыя арганізацыі і паасобныя камуністы плятуць ца ў хвасьце рабочай масы, ня ўмеюць сацспаборніцтва зрабіць мэтадам усёй работы на вытворчасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва—вялікая справа, яно павінна стаць асноўным мэтадам усёй работы па рэалізацыі пяцігодкі. Калі мы за гэту справу, за справу кіраўніцтва ўзрастаючым сацспаборніцтвам ня возьмемся пасапраўднаму, пабальшавіцку, не накіруем творчы пралетарскі энтузіязм на канкрэтную справу, ды так, каб кожны рабочы бачыў вынікі свайго напружаньня, тым мы сарвем, забюракратызуем гэтую добрую ініцыятыву рабочае клясы.

Аб дзяржбюджэце. Ён вырас на 40,5 проц. У гэтым росьце бюджэту вялікую долю складаюць датацыі Савецкага саюзу. У нас, сёй-той з тых, каго цягне на „захад", хныча часамі з поваду яшчэ нібы невыстарчальнай дапамогі Савецкага Саюзу. Але варта зьвярнуцца да нашага бюджэту, каб з усёй сілай падкрэсьліць як многа Савецкі Саюз робіць для эканамічнага і культурнага падцягненьня Беларусі. У галіне таваразвароту мінулы год даў далейшае выцясьненьне прыватніка.

Уцэлым мы здавальняюча справіліся з загатоўкамі. Гэтыя паданыя мною самыя кароткія даныя аб гаспадарчых выніках мінулага году цалкам пацьвярджаюць тыя асноўныя вывады, з якіх я пачаў даклад. На 1929-30 г. мы намецілі плян работы, які перавышае намячэньні пяцігодкі і павышае ў цэлым тэмп росту цяперашняга году асабліва па сацэктару.

Асноўныя вехі кантрольных лічбаў на 1929-30 г.

Вось асноўныя вехі кантрольных лічбаў на 1929-30 г. У галіне сельскае гаспадаркі мы намячаем рост пасеўнай плошчы на 4 проц., рост ураджаю на 20 проц. з вялікім процантам па калгасах і савгасах. Плошча пад калгасамі і савгасамі паводле нашага пляну павінна ў 1929-30 годзе дасягнуць 13 проц. усёй пасеўнай плошчы. Асноўнае зьвяно, за якое нам трэба ўхапіцца яшчэ мацней, ухапіцца рукамі і зубамі, гэта калектывізацыя. Мы намячаем для 1929-30 г. вялікі тэмп калектывізацыі, тэмп, які патрабуе ад нас вялікае ўвагі, волі, матар'яльных сродкаў, вялікай палітычнай і гаспадарчай работы сярод бяднякота-серадняцкіх мас.

Пытаньні сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

А галоўнае трэба, каб уся КП(б)Б усьвядоміла ўсё рашаючае значэньне для ўздыму і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі Беларусі, калектывізацыі. Трэба, каб усе апараты, усе прыводныя пасы ад партыі да бяднякота-серадняцкіх сялянскіх мас, усе вагары былі прыведзены у рух, выразна выконваючы волю партыі, яе генэральную лінію. Гнаць трэба жалезнай мятлой з партыі, з савецкага апарату, не зважаючы на асобы, усякага, хто імкнецца не праводзіць лінію партыі, хто скажае яе. Трэба гнаць з зямельных органаў усіх прыхільнікаў кулацкага хутару, усіх тых, якія ня прымаюць лініі партыі на калектывізацыю. У зьвязку з гэтым я павінен спыніцца ў некалькіх словах на мінулай дзейнасьці Наркамзему. У працягу некалькіх год гэты важнейшы апарат па сутнасьці, па справе не знаходзіўся ў руках партыі. Ён ня выконваў лініі партыі, ён скажаў яе, на справе праводзіў права-апартуністычную лінію. Сёй-той з наркамземанскіх правых ухілістых прабуе цяпер апраўдаць сваю кулацкую работу спасылкай на паасобныя выразы, часамі на выразныя фармулёўкі паасобных адказных таварышоў, каб прыкрыць свае невыпадковыя памылкі, а сьвядомую кулацкую лінію. Ня пройдзе гэты нумар. Уся мінулая лінія і практыка Наркамзему нічога агульнага ня мае з лініяй КП(б)Б. Наркамзем вёў сваю лінію. ХУ партзьезд дакладна абмяркоўваў пытаньні работы на вёсцы і з усёй сілай завастрыў пытаньне на калектывізацыі сельскай гаспадаркі, на сацыялістычнай рэканструкцыі яе, на рашучым наступленьні на кулака. Але пастановы партыі для мінулага кіраўніцтва Наркамзему не закон. У яго была свая лінія на хутар і дробны пасёлак і ён, аддаючы сякую-такую даніну пасьля ХУ зьезду „худу часу", працягваў у цэлым сваю, ня нашу, не партыйную лінію.

Зараз ужо пасьля XII партзьезду мы зьмянілі Прышчэпава, выключылі з партыі Лабаноўскага, высунулі на іх месца новых людзей. Але гэтага, зразумела, мала яшчэ. Трэба ўзмацніць увагу ўсёй партыі да работы на вёсцы, да забясьпячэньня ва ўсёй гэтай рабоце выразнай клясавай лініі.

Трэба паскорыць устанаўленьне гэтых зямельных норм, прыняцьце новага зямельнага кодэксу. Трэба ўмацаваць зямельныя апараты моцнымі бальшавікамі

Некалькі слоў аб навуковых установах, аб ВТНУ. што абслугоўвае сельскую гаспадарку—аб Горацкай с.-г. акадэміі і аб інстытуце імя Леніна. Да іх павінна быць узмоцнена ўвага партыі. Горацкая акадэмія павінна ўсё больш і больш даваць моцныя кадры, нашы кадры, кадры здольныя праводзіць на вёсцы лінію партыі. Горацкая акадэмія павінна нам даваць сотні і сотні камандзіраў для сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, для калгасаў і савгасаў. Не для кулацкага хутара мы рыхтуем агранома, а для барацьбы супроць яго. Нам патрэбен новы малады аграном для калгасаў, для савгасаў, для ўздыму бяднякота-серадняцкае гаспадаркі, для сацыялістычнага перабудаваньня гэтае гаспадаркі,

Інстытут Леніна павінен стаць сапраўды нашай навуковай установай, нашай у выразна клясавых адносінах. Уся работа яго павінна быць цалкам і поўнасьцю пастаўлена на службу справе пралетарскай рэвалюцыі, справе сацыялістычнай рэканструкцыі. Уся навукова-дасьледчая думка ў гэтай установе павінна быць падначалена нашай барацьбе супроць кулака, павінна біцца над тым, каб усю сваю навукова-дасьледчую работу лепш і паўней скарыстаць для справы калектывізацыі.

Трэба, каб імя Леніна ня толькі было напісана на шыльдзе гэтае ўстановы, а каб марксызм-ленінізм пранізваў усю работу інстытуту. А да гэтага часу было так, што якіясьці „навуковыя" ўстановы дастаўлялі кулацкую ідэалёгію для Наркамз., хаця ў яго і сваёй было досыць. Мы нядаўна сабралі ў ЦК групу камуністых аграрнікаў. Іх яшчэ нямнога, усё гэта пераважна моладзь. Але трэба проста сказаць, што сяго-таго з іх сёй-той заціраў, ходу не давалі, да голасу іх ня прыслухоўваліся. Часамі прабівалі сабе дарогу ў вялікія людзі маладыя ды раньнія і ня вельмі вучоныя людзі і ня нашы людзі. Таму мы павінны з асаблівай увагай аднесьціся да выхоўваньня нашых пралетарскіх кадраў, усямерна дапамагаючы ім.

А зазірнеце ў нашы навуковыя ўстановы. Там і дзе шалёная клясавая барацьба, вяюе малады пралетарскі аспірант супроць памешчыцкага, кулацкага сынка, і трэба проста сказаць, што часамі апараты такіх установаў знаходзяцца на баку нашых ворагаў.

Сельскай гаспадарцы, якая сацыялістычна рэканструецца, патрэбны пролетарскія кіруючыя кадры. Мы пачэмы іх стварыць.

Пытаньні прамысловасьці.

Я пераходжу да пытаньня аб нашых задачах у галіне прамысловасьці. Рост прадукцыі на будучы год запраэктаваны на 60 проц. па цэнзавай прамысловасьці і на 65 па рэспубліканскай. Пры гэтым мы запраэктавалі высокія якасныя паказальнікі—зьніжэньне сабекошту прадукцыі на 10 проц., рост прадукцыйнасьці працы на 26,8 проц., рост рэальнай зарплаты на 11 проц., пры зьніжэньні бюджэтнага індэксу на 3 проц. Каб вырашыць гэтыя буйнейшыя задачы прамысловага будаўніцтва Беларусі, трэба з усёй сілай ухапіцца за сацспаборніцтва. У самым бліжэйшым часе прафсаюзы прыступаюць да праверкі ўсёй работы па сацспаборніцтве, да выяўленьня посьпехаў і недахватаў увядзеньня гэтага новага гіганцкага па сваім значэньні мэтаду сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба, каб гэта праверка яшчэ больш узмацніла кіраўніцтва сацспаборніцтвам з боку партыі і прафсаюзаў.

Гаворачы аб прамысловасьці, я павінен спыніць вашу ўвагу на пытаньні аб сампрамкаапэрацыі. Гэта пытаньне было самастойным пунктам парадку дня пленуму. Мы паставілі яго на пленуме таму, што да гэтага часу няма яшчэ з боку партыйных арганізацый належнае ўвагі да сампрамкаапэрацыі, а таксама таму, што ў яе рабоце да гэтага часу не праводзілася выразная клясавай лініі, а наадварот у радзе зьвеньняў яе праводзілася ня наша, а клясава-чужая нам, кулацка-нэпманская лінія. Мы мелі правы ўхіл на практыцы як у цэнтральным праўленьні Белсампрамсаюзу да зьмены кіраўніцтва, так і ў радзе акруговых праўленьняў. Пленум паставіў перад усёй партыяй задачу ўмацаваньня сампрамкаапэрацыі, усямернага яе разьвіцьця і забясьпячэньня ў яе рабоце выразнай клясавай лініі. Роля саматужнай прамысловасьці ў БССР вялікая і вядучы цьвёрдую лінію на ўсямернае, напружаным тэмпам ральвіцьцё фабрычна-заводзкае прамысловасьці, павышэньне ўдзельнае вагі ва ўсёй прамысловасьці мы павінны адначасова аказваць усякую ўвагу і дапамогу справе разьвіцьця саматужнай прамысловасьці, разгортваючы каапэраваньне саматужнікаў. Трэба сампрамкаапэрацыю павярнуць больш, чым да гэтага часу, тварам да вёскі. Трэба думаць, што апошні пленум створыць пералом у гэтым пытаньні.

У галіне таваразвароту мы намецілі далейшае рашучае разьвіцьцё сацэктару і выцясьненьне прыватніка. У 1929-30 г. роля аграмаджанага сэктару павінна складаць 94,3 проц. І гэта накладае на нас асаблівы абавязак значна палепшыць усю работу ўсіх таваразраводзяючых, усіх гандлёвых арганізацый як дзяржаўных, так і каапэрацыйных. Вельмі многа перабояў, недахватаў рынку залежыць ад кепскай, няўразнай бюракратычнай работы нашых дзяржгандлёвых і каапэрацыйных арганізацый.

Мы шмат гаворым аб арганізацыі рынку с.-г. тавараў, аб забесьпячэньні гарадоў малочнымі прадуктамі і гародзінай, а наша каапэрацыя павольна, паабломаўску падыходзіць да вырашэньня гэтых задач. Трэба мацней ударыць самакрытыкай па ўсіх недахватах нашай каапэрацыі. Трэба мацней ударыць самакрытыкай па ўсіх недахватах нашай каапэрацыі. Трэба прымусіць яе шмат лепш абслугоўваць працоўнага спажыўца.

На гэтым я канчаю асьвятленьне ў самым сьціслым відзе тых гаспадарчых пытаньняў, якія стаялі на апошнім пленуме ЦК, і пераходжу да пытаньня аб папярэдніх выніках чысткі і росту партыі.

Папярэднія вынікі чысткі партыі.

Каб вырашыць усе пералічаныя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва і вырашыць выразна, па-бальшавіку трэба партыю ачысьціць ад клясава-чужога, нягоднага і пашырыць яе рады за лік новых і новых, моцных, лепшых пралетараў, батракоў, бедняко-ў-калгасьнікаў. Трэба да кожнага члена партыі падыйсьці з меркай здольнасьці яго на ўсякім месцы, на ўсякай рабоце выразна, бяз хістаньняў праводзіць ленінскую лінію, процістаяць усякаму клясава-чужому ўплыву. Бальшавік павінен быць бальшавіком, вартым байцом авангарду пралетарыяту ўсюды на рабоце і ў быце. Да апошняга пленуму, аб рабоце якога я зараз перад вамі раблю справаздачу, мы мелі вынікі чысткі кіруючых кадраў партыі і чысткі вясковай часткі партыі. Я спынюся ў пачатку на выніках чысткі вясковай часткі партыі. Усяго вычышчана 17 процантаў па сельскіх парт'ячэйках. Сельскія ячэйкі аказаліся моцна засьмечанымі. Нядаўна праведзенае намі спэцыяльнае статыстычнае абсьледваньне камуністых, што працуюць на вёсцы, выявіла, што ў складзе вясковай часткі КП(б)Б было 1 з пад. проц. кулакоў, а па Віцебскай арганізацыі—нават 4 проц. Ва ўсёй вясковай часткі КП(б)Б аказалася толькі 40 проц. беднякоў, у той час, калі абавязкова для нас, каб пераважаючая большасьць складалася з батракоў і беднякоў. Абсьледваньне таксама выявіла, што толькі 9 проц. вясковых камуністых уваходзіць у калгасы. А калі да гэтага невясёлага малюнку дадаць яшчэ элемэнты разлажэньня, прадажнасьць кулаку, змыканьне з ім з боку паасобных камуністых вёскі, то асабліва ясна стане, наколькі востра насьпела чыстка вясковых ячэек, якая толькі што скончылася. Чыстка, якая вызваліла нас ад 17 проц. вясковых камуністых, зрабіла нас у шмат раз больш моцнымі на вёсцы, больш зьвязала нас з батрацкімі і бядняцкімі масамі вёскі. Чыстка праходзіць ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы і адбівае гэтую клясавую барацьбу. На вёсцы да чысткі была праяўлена вялікая цікавасьць. Клясавая барацьба разгортвалася вакол кожнага камуністага, які чысьціўся. Ілжэ-камуністага, падкулачніка, моцна ўсякімі спосабамі абараняў кулак, імкнучыся захаваць сваю агентуру ў партыі, у савеце, у каапэрацыі, за тое-ж, каб выгнаць яго з партыі, змагаліся батрацка-бядняцкія масы.

Моцны-ж бальшавік, калгасьнік, што ідзе ў авангардзе сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, падлягаў часта ўсякім кулацкім паклёпам. Вынікі чысткі і абсьледваньня вясковых партарганізацый з усёй сілай ставяць перад КП(б)Б задачу далейшага рашучага ўмацаваньня сваіх радоў на вёсцы. Задачы нашай работы на вёсцы вялікія, складаныя і цяжкія асабліва на цяперашнім этапе сацыялістычнай рэканструкцыі. Наш клясавы вораг на вёсцы, кулак, хітры, вываротлівы праяўляе шалёнае супраціўленьне ў абароне сваіх пазыцый, і перамоганя барацьба супроць яго патрабуе ад нас, каб на чале бядняцка-серадняцкіх мас ішлі моцныя, баявыя, загартаваныя бальшавікі, каб кожная сялянская парт'ячэйка была баявым штабам наступаючых на кулака калён, была баявым штабам магутнага разгортваньня калектывізацыі. Трэба ўзмацніць вярбоўку ў партыю батракоў, беднякоў, калгасьнікаў. У нас, як я гаварыў ужо, толькі 9 проц. вясковых камуністых уваходзяць у калгасы. Хіба-ж такая партарганізацыя на вёсцы можа стаяць на чале магутнага калгаснага руху. Кожны-ж селянін запытае камуністага, што агітуе за калгас. але ня йдзе ў яго—чаму агітуеш, а сам ня ідзеш?

Таварышы! Мы нядаўна слухалі даклад аб абсьледваньні Тураўскага райкому партыі, гэта вясковы раён Мазыршчыны. Вы напэўна знаёмы з рэзалюцыяй ЦК па гэтым дакладу. Работа аказалася ў раёне нікуды нявартай—ніводнага калгасу, нікуды няварты рост партыі, выкрыўленьне клясавае лініі. Ці выключны гэта раён па кепскай рабоце? Думаю, што не. Трэба проста прызнаць у парадку самакрытыкі, што работа наша ў вёсцы яшчэ скрозь і ўсюды стаіць дрэнна. Трэба дабіцца пералому ў гэтай рабоце. Трэба разгарнуць нашу работу сярод беднаты, трэба ўзмацніць дапамогу рабоце, цяжкай рабоце вясковай партарганізацыі. Пленум ЦК намеціў цэлы рад мерапрыёмстваў узмацненьня вясковай партарганізацыі.

Аб кадрах

Пераходжу да пытаньня аб кадрах. Чыстка кіруючых кадраў пацьвердзіла, што ў цэлым гэтыя кадры здольны кіраваць КП(б)Б, ісьці на чале яе на ленінскім шляху, але адначасова выявіла, што некаторая частка іх няздольна пасапраўднаму, пабальшавіцку праводзіць лінію партыі. Пытаньне аб кадрах набывае асаблівае значэньне зараз, на этапе сацыялістычнай рэканструкцыі. Пры пераходзе да НЭП'у Уладзімер Ільліч казаў аб тым, што гвоздзь усіх пытаньняў—у людзях. Зараз на новым этапе сацыялістычнага будаўніцтва, які суправаджаецца абвастрэньнем клясавае барацьбы, пытаньне аб людзях, пытаньне аб кіруючых кадрах—цэнтральнае пытаньне.

Справа ідзе аб людзях, аб бальшавіках, здольных ісьці наперад, бяз хістаньняў, без галавакружэньняў, цьвёрдым крокам угару. Гутарка ідзе пра людзей, якія не баяцца цяжкасьцяй, не адступаюць палахліва перад імі, якія не паддаюцца націску дробна-буржуазнай стыхіі. Словам, гутарка ідзе пра бальшавікоў, здольных выразна праводзіць лінію партыі. У нас у КП(б)Б гэта пытаньне набывае асаблівую вострасьць у моц таго, што абставіны работы КП(б)Б вельмі складаныя—ня значная праслойка пралетарыяту ў насельніцтве Беларусі, яшчэ меншая праслойка кадравых фабрычна-заводзкіх рабочых; распыленая сялянская гаспадарка в вялізным процантам хутароў, пры нязначнай яшчэ ролі сацыялістычнага сэктару ў вёсцы; мяшчанская стыхія мястэчак і моцны дробна-буржуазны націск у гарадох; складаны нацыянальны пераплёт і пагранічнасьць Беларусі. Унутры КП(б)Б невыстарчальная пралетарская праслойка, невыстарчальная яна і сярод кадраў. Усё гэта разам узятае азначае вялікі націск дробнай буржуазіі на паасобныя праслойкі КП(б)Б. Правы ўхіл, найбольш зараз небясьпечны для ўсёй УсеКП(б), яшчэ больш небясьпечны для КП(б)Б, у моц вышэй пералічаных мною ўмоў работы КП(б)Б. Левыя заскокі, загібы, рэцыдывы трацкізму ў моц таго-ж большага ў Беларусі дробна-буржуазнага націску таксама прадстаўляюць небясьпеку, да якое павінна быць прыкавана ўвага партыі.

Нацыянальная абмежаванасьць, нацыянал-дэмакратызм, шавінізм усіх масьцей таксама націскаюць на некаторых камуністых. Заставіны вельмі, складаныя і патрабуюць ад КП(б)Б, якая стаіць на чале дыктатуры пралетарыяту, якая ўзмацняе ў Беларусі рэжым пралетарскай дыктатуры, якая разгортвае сацыялістычнае будаўніцтва,—моцнага бальшавіцкага адзінства яе радоў, выразнай лініі партыі і бязьлітасным спынам барацьбы з ухіламі ад ленінскай лініі.

Ёсьць такія глупцы, ці глупцы толькі, не сапраўдныя бальшавікі, якія лічаць, што ўсе тыя абставіны работы ў Беларусі, пра якія я гаварыў і аб якіх мы ўсе ведаем, патрабуюць часамі больш мяккіх адносін да ўхілаў, палітычных памылак таго ці іншага камуністага, г. зн. лічаць, што за тое, за што ў Маскве, Ленінградзе, Харкаве выганяюць з партыі, у Менску можна толькі пабацькаўску пагаманіць. Ня выходзіць і ня выйдзе гэта. Камуністы павінен усюды быць камуністым. Чым больш адказны, тым цяжэй абставіны, тым больш вымагальныя павінны мы быць да бальшавіка, тым больш сурова мы павінны падыходзіць да адбору кіруючых кадраў. У сьвятле гэтай устаноўкі пленум ЦК падышоў да пытаньня аб кадрах і даў дырэктыву неадкладна і сьмела разгарнуць работу па вылучэньні новых пралетарскіх кадраў, па падрыхтоўцы іх, адцясьняючы, замяняючы ўсё нягоднае, усё не апраўдаўшае давер'я партыі. Асьвяжыць кадры, узмацніць, пашырыць іх, зрабіць іх яшчэ больш бальшавіцкімі, баяздольнымі—такая дырэктыва пленуму. У кіруючых кадрах можа і павінен знаходзіцца той, хто здольны ісьці наперадзе бальшавіцкай жалезнай калгорты. У кіруючых кадрах няма месца таму, хто блытаецца ў нагах, хто ў клясавых бойках хаваецца ў абоз, уцякае ад агню ў тыл.

Ці можам мы зараз вырашыць пытаньне аб масавым вылучэньні бальшавікоў зьнізу, з гушчы мас на кіруючую работу, ці ёсьць рэзэрвы для гэтага. Так, ёсьць. Трэба прызнаць, мне думаецца, што гэтай першачарговай важнасьці задачы да гэтага часу не аддавалася адпаведнае ўвагі. У нас вельмі многа руціны, кансэрватызму ў справе вылучэньня. Сядзіць чалавек на кіруючай рабоце, сядзіць шмат год, усе навакол прывыкаюць да гэтага і часта ў моц прывычкі церпяць чалавека на кіруючай рабоце, хоць ён зжыў сябе поўнасьцю на ёй. З другога боку мы часта баімся вылучыць добрага нізавога работніка толькі таму, што яго ня ведаюць у ролі адказнага працаўніка. Новыя-ж задачы патрабуюць рашучага вылучэньня новых і новых людзей з гушчы мас. У нас цэлая куча прарываў у Наркамземе, прамкаапэрацыі і на радзе іншых вучасткаў. У нас шмат вучасткаў работы слаба прыкрытых камуністымі, вучасткаў, якія атакуюцца падчас пасьпяхова для сябе нашым клясавым ворагам. Вазьмеце хоць-бы наш культурны фронт. Сюды трэба кінуць масу нашых сіл для барацьбы з чужой нам ідэалёгіяй, і так, пытаньне аб кадрах—важнейшае пытаньне зараз для КП(б)Б.

Рост партыі і рэгуляваньне яе складу

Пераходжу да пытаньня аб росьце партыі, аб рэгуляваньні яе складу. Гэта пытаньне на пленуме было ўвязана з пытаньнем аб чыстцы партыі, выходзячы з таго гіганцкага значэньня, якое чыстка мае для справы вярбоўкі ў партыю і паляпшэньня яе сацыяльнага складу. Мы на пленуме праверылі, як і ў якой меры выконваліся дырэктывы XII-га зьезду партыі па гэтым пытаньні. За паўгода па ўсёй КП(б)Б прынята 2.200 рабочых і батракоў. Процант рабочых падняўся ў складзе партыі з 40,1 проц. да 42,2 проц. Рост ёсьць, але трэба цьвёрда памятаць, што да канца 1930 году, згодна пастанове XII-га партызезду, праслойка рабочых і батракоў павінна складаць 50 проц. усяе партыі. І далёка ня ўсе партарганізацыі прасякнуліся сьвядомасьцю ўсёй важнасьці гэтай задачы. Напрыклад, Віцебская партарганізацыя, якая працуе ва ўмовах вялікіх рабочых рэзэрваў для вярбоўкі ў партыю, прыняла за паўгода толькі 190 чалавек рабочых, менш нават, як некаторыя невялікія акругі. Мы павінны канстатаваць, што ў некаторых арганізацыях не разгорнута выстарчальным тэмпам вярбоўка, а ў іншых у пагоні за колькасьцю не глядзяць на якасьць прымаемых. У Менскай арганізацыі таксама няма яшчэ належнае ўвагі да справы вярбоўкі рабочых у партыю. Камсамол, роля якога ў гэтай справе вялікая, працуе кепска. Летась мы праз камсамол прынялі 41,1 проц. усіх прынятых, а ў гэтым годзе — толькі 35,9 проц. і пры гэтым у ліку перадаваемых камсамолам у партыю некалькі зьменшыўся процант рабочых. За паўгода мы ў партыю прынялі толькі 97 калгасьнікаў, прычым гэта складае 26 проц. усіх прынятых за гэты тэрмін у вёсцы. Вось характарыстыка нашай работы за паўгода па гэтай лініі. Работа яўна невыстарчальная, яўна нездавальняючая. Трэба, каб пастановы пленуму па гэтым пытаньні мабілізавалі ўвагу ўсёй партыі, кожнага яе члена да гэтага пытаньня.

За генэральную лінію партыі.

Таварышы! Я кароткa далажу вам сутнасьць пытаньняў, якія стаялі на пленуме, і пастановы, прынятыя пленумам. Уся сума пытаньняў, што стаялі на пленуме, вынікі перажытага году і намячэньне будучага з усёй сілай пацьвярджаюць правільнасьць лініі партыі і ўсю памылковасьць, усю гніласьць, усю дробна-буржуазную сутнасьць бухарынскай антыпартыйнай лініі. Аднак, ня гледзячы на тое, што ўсе бухарынскія ўстаноўкі і прадраканьні пабіты ўсёй работай партыі, правыя ўхілісты на чале з Бухарыным ня толькі не адмаўляюцца ад сваіх памылак, а ёсьць рад адзнак, якія гавораць аб спробах з іх боку змагацца супроць партыі. Пленум ЦК патрабаваў ад бухарынцаў поўнага і сумленнага адмаўленьня ад сваёй памылковай лініі, у супраціўным выпадку ён прызнаў неабходным, каб бліжэйшы пленум ЦК УсеКП(б) ужыў у адносінах да бухарынцаў аргмеры, намечаныя красавіковым пленумам ЦК УсеКП(б). Але патрабуючы ад Бухарына і ўсіх бухарынцаў адмаўленьня ад сваіх памылак, мы павінны ўзмацніць сваю барацьбу супроць правага ўхілу. Нават калі Бухарын адмовіцца ад сваіх памылак, стане на лінію партыі, правая небясьпека будзе заставацца асноўнай і галоўнай небясьпекай для партыі на сучасным этапе. Зразумела, адыход Бухарына і „иже с ним" ад кіраўніцтва правым ухілам паслабіў-бы правы ўхіл, але ўсё-ж, паўтараю, правая небясьпека застанецца галоўнай, бо не ліквідаваны яшчэ карэньні яе, бо дробна-буржуазнаму націску будуць падпадаць яшчэ паасобныя каморкі партыі. Таму барацьба з правай ідэалёгіяй і правай практыкай павінна быць у цэнтры нашае ўвагі. На цэлым радзе вучасткаў нашай работы мы выкрылі права-ўхілістцкую практыку. Часта мы сустракаемся з такой зьявай, што выяўляем права-ўхілісцкую практыку ў тэй ці іншай арганізацыі, а аказныя за гэта камуністыя ніяк ня могуць зразумець, за што іх б'юць, здымаюць з работы за правыя справы, калі яны, бачыце, заўсёды галасуюць на

НА ПОВАДЗЕ У КУЛАКА.

Партыйная арганізацыя і савецкі апарат Быхаўшчыны заблудзіліся ў лесе кулацкага засільля.

КРЭДЫТАВАНЬНЕ І КААПЭРАВАНЬНЕ КУЛАКОЎ, ПАПОЎ, БЫЛЫХ ПАЛІЦЭЙСКІХ І АДМАЎЛЕНЬНЕ Ў КРЭДЫЦЕ САПРАЎДНАЙ БЕДНАЦЕ.

Прышчэпаў і Лабаноўскі, разам з Магілеўскім акрземаддзелам, знашлі надзейных праваднікоў правага ўхілу ў Быхаўскім раёне па пытаньнях зямельнае палітыкі.

Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта.

„Рыбак рыбака видит издалека, а кулак кулака и еще дальше"—гіранізаваў нядаўна адзін расейскі часопіс. Нам давялося ўбачыць выдзейсьненьне гэтай новаспечанай прыказкі ў Быхаўскім раёне, Магілеўскай акругі. Кулак з ярлыком савецкага служачага і партбілетам у кішэні ўтварыў моцны саюз з кулаком зямлі. Аб гэтым яскрава гавораць бухгальтарскія кнігі крэдытных таварыстваў раёну.

За адзін месяц разьмеркаваньне крэдытаў у Грудзінаўскім таварыстве было наступнае: на бедняка—70 руб., серадняка—65 р., а на заможніка—103 руб. Па здавальненьні крэдытам: заявы беднякоў задаволены на 65 проц., сераднікоў—на 73 проц., а заможных—на 84 проц.; 15 проц. крэдыту ішло выключна ў кулацкія гаспадаркі.

Па Глухскаму крэдытнаму таварыству сярэдняя пазыка для бедняка на рабочай жывёле складае 65,5 руб., для сераднякa—90; па рагатай жывёле — сярэдняя пазыка для бедняка складае 63,5 руб., для сераднякa — 70 руб.; па набыцьцю сельска-гаспадарчага інвэнтару — для бедняка сярэдняя пазыка складала 20 руб. 06 кап., для сераднякa 33 руб. 08 к.

Па Быхаўскаму крэдытнаму таварыству беднята каапэравана па двух сельскіх саветах, якія спэцыяльна браліся для вывучэньня, на 15—18 проц., а заможнікі і кулакі каапэраваны на 66 проц. Сярэдні разьмер аплачанага ная ў бедняка—5 р. 91 к., а ў кулака—5 руб.

Крэдыт атрымліваў мясцовы попа (702 р.), індывідуальна абкладзены кулак Апрэлеў (142 р.) і Малахаў Тодэр (585 р.). Не адмаўлялі Савіну Міколе, які плаціць падатку 500 руб. (атрымаў крэдыту 210 руб.), Удалееву Барталямэю, былому паліцэйскаму (125 р.), Ганчарову Рыгору (716 р.), Кавалёву Паўлюку (337 р.), сыну папа Каладоўскага (190 р.), былому паліцэйскаму Сьлізко Паўлюку (120 р.), прадпрыёмцу - прыватніку Смаліцкаму (495 р.).

Крэдытавалі—каго хацелі, калі хацелі і колькі хацелі. Беднаце заставаліся „рожкі да ножкі". Доўгатэрміновы крэдыт—кулаку, льготы—кулаку, бяднацкі фонд—кулаку. Кулак вырас перад крэдыторамі ў галоўную фігуру вёскі, у вялікую рухаючую сілу сельскай гаспадаркі, якую неабходна падтрымліваць усялякімі мерамі, складаць адпаведныя ўмовы для мірнага ўрастаньня Барталямэяў і Паўлюкоў у сацыялізм. І ня дзіва, вусім ня дзіва, бо і самі крэдыторы—радня кулаку, аднаго балота журавіны.

Не адна крэдытная каапэрацыя дапамагала кулаку ўмацняць сваё эканамічнае становішча. Каапэрацыя зьяўлялася асобнай ячэйкай у агульнай сыстэме арыентацыі на моцнага гаспадара—кулака-эксплёататара. Уся палітыка Райвыканкому кажа аб гэтым.

Трэцяя частка кулацкіх гаспадарак (а іх у райёне 12,5 проц.) не абкладзена індывідуальным падаткам. Трэцяя частка „Сіл Сілычаў" вольна эксплёатуе батракоў, дае ў пазыку атрыманыя ў крэдытным таварыстве грошы, арандуе бяднацкія палоскі, пазычае на насеньне збожжа, гандлюе хлебам.

Загадчык райземчасткі загадваў кожнаму старшыні сельсавету не абкладаць надаткам кулацкія гаспадаркі настаўнікаў. Мясцовыя кулакі, якія „выйшлі ў людзі", толькі за тое, што яны настаўнікі, не абкладзены падаткам у індывідуальным парадку. Замест таго, каб звальняць з працы настаўнікаў-кулакоў, аслабяць іх ад выхаваньня падрастаючага пакаленьня, райвыканком сьвядома праводзіў палітыку падтрыманьня іх, заахвочваньня да далейшай эксплёатацыі беднаты.

Недаімкі па сельска-гаспадарчаму падатку, самаабкладаньню і страхоўцы ў большасьці засталіся за заможнікамі і кулакамі (вёскі: Тошчыца, Тайманава, Грудзінава і іншыя). Да заможных і кулацкіх гаспадарак ня ўжываліся ніякія рэпрэсыўныя меры адносна спагнаньня падатку, у той час, калі ёсьць некалькі выпадкаў няправільнага абкладаньня бяднацкіх і сераднацкіх гаспадарак.

У земляўпарадкаваньні праводзілася лінія банкротаў-наркамземаўцаў: хутары, хутары і хутары... Будаваліся яны на лепшай зямлі, атрымлівалі іх кулацкія гаспадаркі (вёскі Холстава, Стойкі).

Кулакі рабілі фіктыўныя надзелы сваіх гаспадарак і атрымлівалі зямлю на паасобныя двары. Прыкладам гэтага можа служыць вёска Тошчыца. Там-жа кулакі прадалі агульную сенажаць і заплацілі атрыманымі грашыма за земляўпарадкаваньне. Такім чынам, і козы цэлы, і ваўкі накормлены: атрымалі лепшую зямлю і ў такой-жа, калі ня ў большай колькасьці, каморніку заплацілі грашыма ад сенажаці, і, галоўнае, ёсьць гарантыя спакойнага жыцьця на некалькі год; земляўпарадкаваньне адбылося, зямля «выраўнена», ніхто чапаць ня будзе хутарскіх межаў.

Увесь склад райвыканкому ведаў аб махінацыях заможнікаў, але ў пастановах і рэзалюцыях пісаў: **«будаўніцтва хутароў паменшылася і дасягае каля 2 проц.»**. Словы і справы знаходзіліся на двух супроцьлеглых канцавоcьсях, замаскаваныя брудам фальшы і маны. Правая рука ведала, што рабіла левая, але чая і другая хаваліся ад кантролю, а ўласьнікі гэтых «рук» паказвалі зацікаўленым знадворную частку работы, адзін бок издалі.

Ды і хавацца ня было ад каго, бо і само непасрэднае начальства—Магілеўскі Акрзэм—праводзіла хутарызацыю акругі. У справах Быхаўскага райвыканкому ёсьць адносіна Акрземаддзелу за подпісам намесьніка загадчыка Ляўшуновай ад 9-VI—1928 г. наступнага зьместу:

„На 1928 год у В/райёне неабходна пабудаваць арыентыравальна 38 хутароў, 30 пасёлкаў і 1 сельска-гаспадарчую арцель".

Гэта контр-рэвалюцыйная на сутнасьці адносіна праліває сьвятло на хмурыя сьцены акрземаддзелу і наогул на раённы зямельны апарат акругі. Трэба, як мага хутчэй, правесьці практыку земляўпарадкаваньня ў Магілеўскай акрузе, выкрыць канкрэтных „прышчэпаўцаў", ідэолёгаў кулацкае часткі сялянства.

Праўда, беднота і лепшая частка сераднацтва разьбівае ланцугі, утвораныя кулакамі ў акулярах, арганізоўвае арцелі і камуны. Але, знаходзячыся пад двума прэсамі: зьнізу—кулак зямлі, зьверху—кулак савецкае ўстановы,—калгасы ня вытрымліваюць і развальваюцца. Так, у мінулым годзе арганізавалася 13 калгасаў, з іх развалілася 6. Тыя-ж, што засталіся, не карыстаюцца ніякай дапамогай і ўвагай ні з боку райвыканкому, ні з боку партарганізацыі і знаходзяцца на становішчы хворага бяз доктара.

Таварышы—па супольнай апрацоўцы зямлі, малочныя, мэліарацыйныя, агнятрывалыя, машынныя—засьмечаны кулакамі і заможнымі гаспадарамі. Кулак убачыў карысьць ад гэтых аб'яднаньняў і першы ўвайшоў у склад іх, а ў некаторых мясцох зьявіўся ініцыятарам арганізацыі таварыстваў, прадез у праўленьне і падпарадкаваў калектыўныя аб'яднаньні сваім уласным інтарэсам.

Кулак пралазіць ня толькі ў першапачатковыя калектыўныя аб'яднаньні, але і ў спажывецкую каапэрацыю, і ў сельска-гаспадарчую, і нават у сельсаветы. У складзе выбарчых органаў і да гэтага часу ёсьць індывідуальна абкладзеныя. Было некалькі выпадкаў, калі мясцовы поп дапушчаўся да разьмеркаваньня мануфактуры і заўсёды атрымліваў тавары на дзьве каапэрацыйныя кніжкі. Сын папа да канца 1928 г. загадваў клюбам савгасу Грудзінаўка; мясцовыя партыйцы і камсамольцы і зараз кажуць, што гэта звычайна, „обыкновенно".

У рабоце самога савгасу Грудзінаўка да гэтага часу было бязладзьдзе і безгаспадарчасьць, рабіліся растраты і падлогі, адміністрацыя складалася выключна з кулакоў і моцных заможнікаў.

Грудзінаўскі сельсавет, на тэрыторыі якога знаходзіцца дэфіцытны калгас, рашуча праводзіў «клясавую лінію». Гэта „клясавая"... кулацкая лінія выдавала папу і дзяку лесаматар'ял, надзяліла папа зямлёю ў колькасьці 10 дзесяцін, прадала яму-ж савгаскі дом. „Клясавая лінія" прымала кулацкіх сынкоў у школу сялянскай моладзі і адмаўляла ў прыёме дзяцей сапраўднай беднаты.

У партыйнай арганізацыі налічваецца шмат варожых нам людзей, прадстаўнікоў і абаронцаў кулацтва.

Чым, як ня гэтым, тлумачыцца продаж камунай імя Карла Лібкнэхта з ведама і са згоды партячэйкі крахмалу прыватніку і вынясеньне яму шчырай падзякі за прыкладнае выканаьне гандлёвай умовы?

Чым, як ня гэтым, тлумачыцца арганізацыя камуністам Ціханцовым кулацкай арцелі?

Масавыя растраты ў каапэрацыі?

Прыняцьце на службу ў спажывецкую каапэрацыю былога фабрыканта Ліўшыца?

Выдача рэкамэндацый для ўступленьня ў партыю былому попу Лапурка?

Няпрыняцьце рабочага Руткоўскага ў партыю?

Сувязь сэкратара Тошчыцкай ячэйкі, Вінаградава, з кулакамі і папамі?

Некалькі выпадкаў згвалчаньня жанчын партыйпамі?

П'янства, п'янства і п'янства?

Партарганізацыя сышла з клясавых рэек, згубіла праграму і статут, запамятавала пастановы 15-га партзьезду аб рашучым наступе на кулацка-нэпманскія элемэнты гораду і вёскі.

У хвалях самагону таніліся партыйныя ячэйкі.

Знаходзіліся розныя прычыны для кампанійскіх выпівак: нараджэньне сына, чырвонае вясельле, атрыманьне зарплаты, удалы даклад. Але ў большасьці пілі бяз дай прычыны, без усялякага поводу, проста таму, што піць хацелася. Падпісвалі ўмовы са знаёмымі аб спыненьні п'янства, парушалі іх і зноў пілі. Для ілюстрацыі падамо адну з шматлікіх умоў, зробленую паміж камуністам Ратнікавым і беспартыйным рабочым Бутомо:

„28 июня 1929 г., мы, нижеподписавшиеся, Ратников и Бутомо, заключаем настоящий договор на спиртные напитки: даем друг другу согласие не пить спиртных напитков восемь месяцев—с 28 июня 1929 г. по 28 января 1930 г. и накладываем штраф в размере 25 руб., если будет замечено за кем нибудь".

Па адвароце ўмовы ёсьць заўвага такога зьместу:

«Выпивка 2-х бутылок пива разрешается. Повышать и понижать норму воспрещается.

Подписи: Ратников и Бутомо».

Умова зацьверджана рабочым камітэтам за подпісам старшыні Шчапачова (камуніст) і сэкратара, за належнай рабачкомаўскай, пралетарскай пячаткай.

Што можна было патрабаваць ад партыйных п'яніц і камуністаў-кулакоў? Работы? Падтрыманьня беднаты? Арганізацыі калгасаў? Не патрабаваць ад іх немагчымага, а гнаць з партыі, звальняць з пасад, садзіць на лаўку падсудных!

«Мы ўпэўнены ў тым»,—піша акруговая газэта ў перадавіцы ад 18 верасьня,—„што рашэньні, вынесеныя бюро АК КП(б)Б, дапамогуць Быхаўскай райпартарганізацыі выправіць усе зробленыя памылкі, асабліва ў кіраўніцтве Райкому КП(б)Б. Выпраўленьне гэтых памылак патрабуе напружаньня ўсіх сіл партарганізацыі".

Што за „памылкі"? Што за кваліфікацыя правага ўхілу ў нявінныя „памылкі", тым больш, што некалькімі радкамі вышэй газэта піша:

«Тое, што кулалі аказвалі ўпліў на работу асобных ячэек, (што крэдыты ішлі ў першую чаргу кулакам, што гаспадаркі іхныя расьлі значна шпарчэй чым бяднацкія—гэта нішто, гэта рэч у разуменьні быхаўскіх, гэтак сказаць, «кіраўнікоў», рэч зусім звычайная. Раённы камітэт партыі ня здолеў кіраваць ячэйкамі, быў адарваны ад працоўных мас, ня змог на падставе самакрытыкі стаць на чале рабочых і бяднацка-сераднацкіх колаў і мабілізаваць усю іх увагу для выкананьня чарговых задач партыі па рашучаму наступу на рэшткі капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі, за далейшае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва".

Тут не „памылкі", а нешта больш глыбокае, менавіта ўхіл на практыцы, ад чаго і сама газэта на адмаўляецца. А калі так, дык ня толькі адным зьняцьцем з працы сэкратара Райкому партыі ліквідуецца „Быхаўская справа", не зьмяшчэньнем у адным нумары „Магілёўскага Селяніна" артыкулу „Партыйная арганізацыя Магілёўшчыны моцна стаіць на ленінскім шляху",—зьнішчаецца правы ўхіл. Вядома, акругком партыі вельмі правільна зрабіў, што выкрыў быхаўскіх „палітыкаў" і ўжыў першы крокі да аздараўленьня арганізацыі, але трэба спаву давесьці да канца, вывесьці на чыстую воду кулацкіх аборонцаў і непасрэдных кулакоў з парт'ячэек, савецкіх устаноў, спажывецкай і сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Акрвыканкому неабходна ўжыць меры да ачышчэньня ад кулацкага бруду РВК і сельсаветаў, а ў першую чаргу—акруговага зямельнага аддзелу.

Эр.

КУЛЬТУРУ—ПРАЦОЎНЫМ МАСАМ.

ЗЬВЯНО, ЗА ЯКОЕ ТРЭБА ЎЗЯЦЦА.

(Таварыскі ліст рабселькораўскаму гуртку пры Магілеўскім палітасьветным тэхнікуме).

Дарагія таварышы.

Я выпадкова даведаўся, што пры Магілеўскім п.-асьветным тэхнікуме ёсьць рабселькораўскі гурток. Кароткая гутарка з асобнымі працаўнікамі тэхнікуму і асобнымі ўдзельнікамі гэтага гуртка пераканала мяне ў тым, што ў вас ёсьць вялікія магчымасьці, каб гэты гурток разгарнуў шырокую і надзвычайна карысную працу. Але-ж пры гэтым у мяне засталося ўражаньне, што гэты гурток не знайшоў таго зьвяна, за якое ў сучасны момант трэба ўзяцца рукамі і зубамі, каб выцягнуць доўгі ланцуг эфэктных дасягненьняў у галіне канкрэтнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі нашай партыі.

Кароткі абмен думкамі пераканаў мяне і ў тым, што вы шукаеце зараз гэтае зьвяно, што вы ўлічаеце сабе неабходнасьць сканцэнтраваньня сваёй увагі на адным галоўным канкрэтным пытаньні, каб скарыстаць на вырашэньне гэтага пытаньня ўсе свае магчымасьці, дабіцца поўнага эфэкту ад сваёй працы і даць максымум рэальных дасягненьняў.

У гутарцы з вамі мною была высунута думка аб тым, што **палітасьветны тэхнікум мог-бы з посьпехам заняцца справай культурнага абслугоўваньня калгаснага руху** на вёсцы.

Думаю, што мне ня трэба даводзіць вам, што калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў сучасны момант зьяўляецца актуальным пытаньнем дня. Пра гэта вы добра ведаеце з пастаноў XV усесаюзнага зьезду УсеКП(б) і рашэньняў усесаюзнай партканфэрэнцыі; пра гэта сьведчыць наша пяцігодка; асабліва-ж красамоўна пра гэта кажуць пастановы апошняга верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б.

Пленум ЦК КП(б)Б прапануе **„рашуча палепшыць культурнамасавую працу ў савгасах і калгасах, якая павінна быць накіравана на разьвіцьцё сацыялістычна-сьвядомых адносін да вытворчасьці, узмацненьня працоўнай дысцыпліны, падвышэньня культурнага ўзроўню рабочых".**

Паколькі думка мая аб неабходнасьці актыўнага ўдзелу з боку палітасьветнага тэхнікуму ў культурным абслугоўваньні калгаснага руху спаткала ў вас шчырае падтрыманьне, я рашыў у гэтым лісьце канкрэтна спыніцца на той ролі, якую можа ўзяць на сябе рабселькораўскі гурток тэхнікуму.

Рабселькораўскі гурток пры дапамозе ўсяго настаўніцка-студэнцкага калектыву, па майму глыбокаму перакананьню, можа сьмела ўзяць на сябе ролю арганізацыйнага цэнтру для наладжаньня сацыялістычнага спаборніцтва паміж хатамі-чытальнямі на лепшае культурнае абслугоўваньне калгасаў і калгаснага руху.

Гэта сьцьвярджэньне я абгрунтоўваю наступным; палітасьветны тэхнікум—установа, якая рыхтуе хатніка, мае поўную магчымасьць і мэтадычна і арганізацыйна прывесьці канкрэтную **падрыхтоўку** хаты-чытальні (хаця-б сваёй падпэфнай) да спаборніцтва; сувязь студэнтаў тэхнікуму (асабліва ў часе зімовай і летняй практыкі) з хатамі-чытальнямі забясьпечвае магчымасьць **дапамогі** з боку студэнтаў хатам-чытальням і **праверкі** ходу сацыялістычнага спаборніцтва.

У каго-небудзь мімаволі можа зьявіцца пытаньне: чаму гэта рабселькораўскі гурток павінен узяць на сябе ролю арганізацыйнага цэнтру?

А вось чаму. Уся праца, якую павінен правадзіць рабселькораўскі гурток (ясна, пры актыўным удзеле ўсяго калектыву тэхнікуму) павінна знайсьці яскравы адбітак на старонках нашага друку. Для гэтае справы „Савецкая Беларусь" ня будзе шкадаваць месца, бо я ўпэўнены, што шырокае асьвятленьне на старонках газэты ходу сацыялістычнага спаборніцтва паміж хатамі-чытальнямі, якія да рэчы сказаць, у гэтай галіне амаль што нічога ня робяць,—можа зрабіць з малога пачыну вялікую справу.

Дзякуючы гэтаму, роля рабселькораўскага гуртка набывае асабліва значэньне. Будучы зьвязаны непасрэдна са ўсёй студэнцкай масай, якая будзе выяжджаць на практыку, а з другога боку, трымаючы сувязь з газэтай „Савецкая Беларусь", гурток, як ніхто лепш, можа наладзіць асьвятленьне гэтае справы ў газэце.

Дарагія таварышы! Я ўпэўнены, што **больш актыўныя, больш падрыхтаваныя хатнікі самі непасрэдна адкінуцца на мой ліст і распачнуць справу.**

Я думаю, што вы, як і ўвесь калектыў тэхнікуму, зробіце ўсё, каб падтрымаць ініцыятыву асобных хатнікаў у галіне культурнага абслугоўваньня калгаснага руху. Чакаю, што ваш адказ на мой ліст будзе паведамленьнем аб канкрэтных кроках, якія вы зробіце для выкананьня высунутых мною прапаноў.

Са шчырым таварыскім прывітаньнем **П. Шастакоў.**

Не на словах, а на справе.

Пастанова ЦК КП(б)Б гаворыць аб стопроцантнай ліквідацыі няпісьменнасьці ў гарадох. У Менску для выкананьня гэтай пастановы нам патрэбны кадры, памяшканьні, падручнікі і ўдзел усіх грамадзкіх і савецкіх арганізацый у гэтай рабоце.

Пэдфак БДУ першы пачаў справу мабілізацыі шырокіх грамадзкіх мас за справу ліквідацыі няпісьменнасьці: пастанова аддзяленьняў пэдфаку—літаратурнага, прыроднага і матэматычнага аб тым, што мабілізавана ўсё студэнцтва для ліквідацыі няпісьменнасьці, гаворыць аб гэтым досыць выразна. Удзел студэнцтва ў шырокай грамадзкасьці пачынае падмяняць бюракратычныя ведамсьцьвенныя адносіны да справы ліквідацыі няпісьменнасьці з боку органаў Наркамасьветы.

21-га верасьня на парадку дня прэзыдыуму цэнтральнага савету т-ва „Прэч Няпісьменнасьць" было пастаўлена пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці ў Менску. З дакладу і спрэчак відаць, што падрыхтоўка на сёньняшні дзень праведзена габінэтным парадкам бяз удзелу шырокай гра мадзкасьці. Думка аб прыцягненьні грамадзкасьці ў часе месячніка за пісьменнасьць засталася толькі думкаю. Эфэкту ад гэтай работы ня было. Бюракратычныя спробы паасобных працаўніковў на прэзыдыуме ЦС апраўдацца, што былі дадзены такія і такія-та ўказаньні аб пачатку навучальнага году, аб кадрах, аб падручніках, не знайшлі спачуваньня з боку ўдзельніка ў цэнтральнага савету. Яны былі асуджаны.

Адзначыўшы, што работа па Менску праароблена недастатковая, праводзілася толькі ведамсьцьвенным шляхам, ЦС т-ва „Прэч Няпісьменнасьць" пастанавіў выдзеліць часовую спэцыяльную камісію з 5 чалавек, якой даручана распрацаваць пытаньні адносна вучоту ўсяго няпісьменнага насельніцтва па Менску, вылучэньня кадраў са студэнцкага асяродку для перапісу і практычнай работы ў лікпунктах на працягу навучальнага году, згуртаваньня грамадзкай думкі вакол ліквідацыі няпісьменнасьці праз друк, сходы розных арганізацый, мабілізацыю шырокіх пластоў грамадзкасьці для правядзеньня палітыка-асьветнай работы ў лікпунктах.

У бліжэйшыя дні камісія павінна даць папярэднія вынікі сваёй работы. Мы іх чакаем.

Адначасова з гэтым шчыра вітаем пэдфакаўцаў, пінэраў гэтай вялікай справы, якая пачата імі. Жадаем ім посьпеху!

В. М.

С.-гаспадарчыя веды ў сялянскія масы.

Згодна 5-цігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР Народны Камісарыят Асьветы мяркуе ў бягучым навучальным годзе па ўсіх раённых цэнтрах арганізаваць 1 ½ месячныя агранамічныя курсы.

Гэтымі курсамі мяркуецца ахапіць да 5000 вясковых комсамольцаў і наогул вясковых актывістаў.

Новыя школы с.-гаспадарчага вучнёўства.

Наркамасьветы БССР мяркуе адчыніць сёлета пры больш буйных савецкіх гаспадарках тры школы сялянска-гаспадарчага вучнёўства. Школамі будзе ахоплена звыш 180 чалавек падросткаў (бронь).

РЫХТУЕМСЯ ДА „ДНЮ УРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ".

Кожны год працоўныя масы СССР увосень сьвяткуюць «Дзень ураджаю». Сьвята ўраджаю ў мінулыя гады праходзіла ў асноўным пад лёзунгам патулярызацыі сярод сялянства агратэхнічных мерапрыемстваў і ўкараненьня апошніх у сельскую гаспадарку. У мінулыя гады галоўным чынам падводзіліся вынікі росту і разьвіцьця індывідуальных сялянскіх гаспадарак.

На сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва мы ні ў якім разе ня можам задаволіцца тымі лёзунгамі, тымі задачамі, тымі мэтадамі, якія былі характэрны для зьместу і сутнасьці сьвята ўраджаю ў мінулыя гады. Рабочая кляса і працоўнае сялянства пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вырашаюць у сучасны момант вялізарнейшыя задачы сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнай гаспадаркі і ў прыватнасьці сацыялістычнай перабудовы вёскі на аснове вытворчага аграмаджаньня паасобных індывідуальных гаспадарак.

Разьвіцьцё сельскай гаспадаркі ідзе ў далейшым будзе ісьці па шляху калектывізацыі, праз вытворчае аб'яднаньне бяднацка-сераднацкіх індывідуальных гаспадарак у буйныя аграмаджаныя формы. Трэба памятаць словы У. І. Леніна, які казаў, што далейшы пераход у сельскай гаспадарцы нямінуча заключаецца ў тым, каб нявыгадную, адсталую, дробную сялянскую гаспадарку паступова аб'яднаць і арганізаваць у буйную грамадзкую земляробскую гаспадарку. Вось чаму ў гэтым годзе, калі мы маем вялізарны рост калгаснага руху, калі і ўзьняцьце ўраджайнасьці залежыць ад аграмаджаньня індывідуальных гаспадарак, дзе магчыма прымяняць лепшыя спосабы апрацоўкі зямлі, дзе магчыма прымяняць складаныя буйныя сельска-гаспадарчыя машыны, „Дзень ураджаю" зьвязваецца з калектывізацыяй, вось чаму і сьвята носіць назву „Дзень ураджаю і калектывізацыі".

Сама назва „Дзень ураджаю і калектывізацыі" поўнасьцю адпавядае тым задачам, якія ў сучасны момант пастаўлены партыяй у справе перабудовы сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя і ўзьняцьце ўраджайнасьці—гэта дзьве неразрыўныя часткі агульнага перабудоўчага працэсу ў сельскай гаспадарцы.

Нашы задачы ў „Дзень ураджаю і калектывізацыі".

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі ставіць перад працоўнымі масамі шэраг надзвычайна важных практычных задач, на вырашэньні якіх у сучасны момант згуртавана ўвага партыйных арганізацый, рабочае клясы і ўсёй савецкай грамадзкасьці. Гэтыя задачы асабліва выпукляюцца ў сувязі з „Днём ураджаю і калектывізацыі". У „Дзень ураджаю і калектывізацыі" мы павінны згуртаваць увагу на наступных асноўных задачах.

У галіне савгаснага будаўніцтва неабходна падвесьці вынікі працы за год, усямерна дапамагчы ўзмацненьню і ўзбуйненьню існуючых савгасаў. У „Дзень ураджаю і калектывізацыі" павінна быць разгорнута шырокая масавая калектывізацыя індывідуальных гаспадарак, узбуйненьне старых калгасаў. Асабліва ўвага павінна быць зьвернута на райёны, дзе праводзіцца масавая калектывізацыя. Поруч з гэтым неабходна падрыхтаваць глебу для ўтварэньня буйных машынных і трактарных станцый, шырока разгарнуць працу па разьвіцьцю агранамічнай рэвалюцыі ў сельскай гаспадарцы, па ўзьняцьцю ўраджайнасьці, па разгорваньню сацыялістычнага спаборніцтва ў сельскай гаспадарцы, па кантрактацыі і прасоўваньню 3-й пазыкі індустрыялізацыі ў вёску.

Усе гэтыя галоўныя задачы патрабуюць добрай, дакладнай і своечасовай падрыхтоўкі, як цэнтральных і мясцовых савецкіх органаў, так і грамадзкіх арганізацый, каб належным чынам правесьці „Дзень ураджаю". Асноўнае, на што асабліва ўвага павінна быць зьвернута—гэта на **мабілізацыю рабочых савгасаў, калгасьнікаў і бедняцка-сераднацкай масы сялянства вакол задач „Дню ўраджаю і калектывізацыі".**

Мерапрыёмствы органаў Наркамзему.

Наркамзем па сваёй лініі даў шэраг указаньняў мясцовым органам аб падрыхтоўчай працы і правядзеньню „Дню ўраджаю і калектывізацыі". У сваіх мерапрыёмствах Наркамзем вызначае наступнае: падвесьці вынікі дасягненьняў па калектывізацыі сельскай гаспадарцы, вытворчаму каапэраваньню, па ўкараненьню масавых агрыкультурных мерапрыёмстваў, аграмінімуму праз арганізацыю сельска-гаспадарчых выставак. Мясцовыя органы НКЗ асабліваю ўвагу павінны зьвярнуць на збор экспанатаў, прычым галоўным чынам з аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі. Разам з гэтым на органы НКЗ усклаваюцца задачы: арганізацыя выставак, адбор экспанатаў на Усебеларускую сельска-гаспадарчую выстаўку, арганізацыя экскурсій сялян на дасьледчыя станцыі, арганізацыя сходаў, мітынгаў, карнавалаў, адчыненьне культурна-бытавых устаноў. НКЗ мяркуе паслаць на месца працаўнікоў для ўдзелу ў падрыхтоўцы і правядзеньню „Дню ўраджаю і калектывізацыі.

Па лініі калгассыстэмы.

Калгассаюз таксама распрацаваў шэраг мерапрыёмстваў па падрыхтоўцы і правядзеньню дню ўраджаю і калектывізацыі. Поруч з тымі мерапрыёмствамі, якія намечаны плянам Наркамзему і якія ўваходзяць у плян калгассаюзу і зьяўляюцца абавязковымі для правядзеньня, калгассаюз па сваёй лініі высоўвае некаторыя новыя моманты. **Асабліва заслугоўвае ўвагі ўсёй савецкай грамадзкасьці пытаньне ўтварэньня пралетарскага т-ва садзейнічаньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі.** Гэтае пытаньне мае вялізарнейшае значэньне і яно павінна сустрэць шырокае спачуваньне і падтрыманьне з боку рабочых арганізацый. Па нашай думцы такое т-ва неабходна ўтварыць. У калгасах мяркуецца правесьці вытворчыя нарады, арганізаваць суботнікі і адчыніць у некаторых калгасах у дзень ураджаю і калектывізацыі шэраг культурна-бытавых устаноў; дзіцячыя ясьлі, школы, сталоўкі, хаты-чытальні і каапэрацыйныя крамы.

Як павінна прайсьці сьвята ў савгасах.

Белсельтрэст дае шэраг указаньняў савгасам як правесьці падрыхтоўку і сьвята дню ўраджаю і калектывізацыі. Асноўнае, на што павінна быць зьвернута ўвага па лініі савгасаў—гэта на падвядзеньне вынікаў росту савгасаў, узбуйненьне іх, мэханізацыі працы, росту капіталаў, узьняцьцю ўраджайнасьці, палепшаньня матар'яльнага становішча і дабрабыту рабочых і зьнижэньне сабекошту прадукцыі. Савгасы павінны таксама абмеркаваць пытаньне аб прыняцьці і ажыцьцяўленьні шэфства над некаторымі калгасамі. Дзень ураджаю—падвядзеньне вынікаў усёй працы за год, вось чаму неабходна, каб у савгасах падагулены былі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва і вынікі дапамогі савгасаў бяднацкай частцы сялянства. Савгасы павінны дапамагчы бяднацка-сераднацкім масам сялянства ў адборы экспанатаў на райённыя выстаўкі.

Па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

Уся сетка сельска-гаспадарчай каапэрацыі павінна шырока разгарнуць працу па садзейнічаньню арганізацыі новых калектыўных аб'яднаньняў і спэцыяльных вытворчых с.-г. каапэратываў. Дзень ураджаю і калектывізацыі павінен прайсьці пад знакам замацаваньня і разьвіцьця існуючай сеткі сельска-гаспадарчай каапэрацыі, пад знакам забясьпечаньня сацыялістычнага сэктару гаспадаркі грашыма і сродкамі вытворчасьці. Дзейнасьць с.-г. каапэрацыі павінна мець уплыў на сацыялістычную перабудову вёскі. Задача с.-г. каапэрацыі—садзейнічаць індустрыялізацыі с.-гаспадаркі, шляхам пабудовы новых прадпрыёмств на апрацоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў. У дзень сьвята ўраджаю неабходна паставіць задачу максымальнага ахопу бяднацка-сераднацкай масы сялянства рознымі відамі сельска-гаспад. каапэрацыі. Сельгаскаапэрацыі неабхона парупіцца і аб лепшым культурным абслугоўваньні пайшчыкаў.

Удзел культасьветных устаноў.

Наркамасьветы дае ўказаньні ўсім культасьветным установам прыняць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўчай працы і правядзеньні дню ўраджаю і калектывізацыі. Канкрэтна намечана наступнае: у хатах-чытальнях, школах і іншых культасьветных установах павінны быць праведзены гутаркі з сялянамі на тэмы: пяцігадовы плян народнай гаспадаркі і III пазыка індустрыялізацыі, аб значэньні калектывізацыі с.-г. і аграмінімуму, на антырэлігійныя тэмы і г. д.

Асьветнікі павінны дапамагчы выпусьціць насьценныя газэты, прысьвечаныя дню ўраджаю і калектывізацыі, разгарнуць шырока антырэлігійную працу, прыняць удзел у падрыхтоўцы сельска-гасп. выстаўкі і падрыхтаваць свае экспанаты, калі яны ёсьць, узяць культурнае шэфства над бліжэйшым калгасам па зьнішчэньню няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, разгарнуць працу па прасоўваньню сельска-гаспадарчай літаратуры ў вёску. Асабліва асьветнікі павінны дапамагчы ў наладжаньні культурна-мастацкага абслугоўваньня сходаў, мітынгаў і т. д. Да дню ўраджаю і калектывізацыі прыстасоўваецца па лініі Наркамасьветы адчыненьне ў некаторых калгасах і савгасах дзіцячых садоў, ачагоў, пляцовак, школ, лікпунктаў і хат-чытален.

Белкаапсаюз і КСУ таксама рыхтуюцца да правядзеньня дню ўраджаю і калектывізацыі. Белкаапсаюз мяркуе адчыніць на свае сродкі ў калгасах 8 дзіцячых ясьляў, арганізаваць шэраг бібліятэк, пашырыць сетку крам і наогул палепшыць абслугоўваньне спажыўца. Камітэт сялянскай узаемадапамогі дае ўказаньні сваім нізавым зьвеньням аб падрыхтоўцы і збору экспанатаў для выставак, аб пашырэньні сеткі вытворчых аб'яднаньняў і арганізацыі экскурсій у савгасы, калгасы і на дасьледчыя станцыі.

Масавая праца.

На шырокае разгортваньне і належную пастаноўку масавай працы павінна быць зьвернута максымум увагі. Сходы, мітынгі, урачыстыя насяджэньні, правядзеньне масавых гутарак, вечары змычкі сялян сходаў з рабочымі павінны шырока практыкавацца, масава праводзіцца як у час падрыхтоўчай працы да сьвята, так і ў самы дзень сьвята дню ўраджаю і калектывізацыі. Канкрэтна па гэтых масавых сходах рабочых савгасаў, калгасаў і бяднацка-сераднацкай масы сялянства неабходна завастрыць увагу на пытаньнях 5-цігадовага пляну гаспадарча-культурнага будаўніцтва і шляхох разьвіцьця сельскай гаспадаркі, выніках калгаснага і савгаснага будаўніцтва, падвядзеньні вынікаў ураджайнасьці і ажыцьцяўленьні агрыкультурных мерапрыемстваў, арганізацыі бяднацка-сераднацкай масы сялянства для барацьбы за сацыялістычную перабудову вёскі і наступу на кулака, на пераводзе простых форм калектывізацыі ў больш складаныя, вышэйшыя формы.

У дзень ураджаю і калектывізацыі павінна быць таксама зьвернута ўвага на поўнае скарыстаньне фондаў беднаты для каапэраваньня батрацтва і бяднейшай часткі сялянства, па арганізацыю чырвоных абозаў, па прасоўваньне 3 пазыкі індустрыялізацыі і шырокае разгортваньне антырэлігійнай працы ў разгортваньні масавай працы павінны ў гарадох адыграць галоўную ролю дамы сялянина.

Да дню ўраджаю і калектывізацыі трэба паставіць пытаньне аб арганізацыі прыгарадных агародных каапэратываў. Справа ў тым, што разьвіцьцё гэтага віду каапэрацыі будзе мець вял

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ І ПАРТКАЛЕГІІ ЦКК КП(б)Б

АД 19 ВЕРАСЬНЯ 1929 г.

АБ ВЫКЛЮЧЭНЬНІ З КП(б)Б ПРЫШЧЭПАВА З. П.

Прышчэпаў З. П., член КП(б)Б з 1918 г., служачы—настаўнік, быў у партыі эсэраў у 1917-18 г. г., партспагнаньням падпадаў: у 1923 г. пастановаю Віцебскай Губ. КК за няўплату членскіх узносаў на працягу году абвешчана вымова з папярэджаньнем, у 1928 г. пастановаю ПК ЦКК пастаўлена на від за няправільны прыём на працу ў НКЗ асоб, вычышчаных з другіх устаноў, былы Нарком Земляробства БССР.

Абвінавачваецца ў тым, што, будучы Наркомам Земляробства, на працягу шэрагу гадоў праводзіў кулацкую, праваапартуністычную лінію ў кіраўніцтве зямельнымі органамі і дапушчаў сыстэматычныя выкрыўленьні клясавай лініі партыі, што выявілася ў правядзеньні лініі па насаджэньні моцных хутарскіх гаспадарак, дзеля чаго былі выпрацаваны НКЗ спрыяючыя разьвіцьцю кулацкіх гаспадарак нормы землякарыстаньня, наперакор дырэктывам партыі выдаваў адміністрацыйныя дырэктывы, якія супярэчаць палітыцы партыі, аб падтрыманьні хутарызацыі, як, напрыклад: сакрэтны абежнік, выданы асабіста Прышчэпавым, быў утоен ад парторганаў і быў накіраваны на забарону будаўніцтва буйных пасёлкаў і на рашучае разьвіцьцё хутароў і адрубаў, і дырэктывы аб забароне прыстасаваньня іншых форм землякарыстаньня, акрамя хутароў; напр., Полацкім Земорганам, ня гледзячы на пратэсты мясцовых арганізацый, была дадзена дырэктыва аб абавязковым разьвіцьці хутарской формы і забароне пасялковай, выходзячы з таго, што быццам мясцовыя ўмовы спрыяюць толькі хутарской і адрубнай сыстэме. Гэтая лінія, якая ня спынілася і пасьля XV зьезду партыі, зьяўлялася нічым іншым, як супраціўленьнем разгортваньню калектывізацыі і наогул сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, калі апарат земорганаў па лініі земляўпарадкаваньня і аграноміі ў значнай колькасьці выпадкаў праводзіў актыўнае падтрыманьне хутарызацыі і да апошняга часу ня быў праваднікам калектывізацыі на вёсцы. Гэта лінія праваапартуністычнай палітыкі НКЗ атрымала свой адбітак як у выданьні палітычна-шкодных законадаўчых актаў, напр., аб парадку землекарыстаньня служыцеляў рэлігійных культаў і былых абшарнікаў, так і ў праэкце пяцігодкі па сельскай гаспадарцы, які потым быў адхілены, і ў якім абгрунтоўвалася выключна надворная форма землякарыстаньня са спасылкамі на традыцыі „з часу Сігізмунда Аўгуста", пры адначасовым указаньні на рэмагчымасьць разьвіцьця калектыўных форм гаспадаркі. Актыўнае супраціўленьне дырэктывам XV зьезду выказалася і ў тым, што дырэктывы партыі аб калектывізацыі і сацыялістычным наступленьні на капіталістычныя элементы ўсялякім чынам затрымліваліся ажыцьцяўленьнем у заканадаўчым парадку, і калі партыйныя органы паставілі пытаньне аб скажэньні клясавае лініі, з боку НКЗ і яго кіраўнікоў рабіліся ссылкі на тое, што скажэньні ёсьць вынік неперапрацаванага законадаўства.

На лініі судова-зямельных органаў гэтая анты-партыйная лінія Наркома выявілася асабліва ў палітычна-шкодным дзейнасьці АКВК і яе кіраўніка Лабаноўскага (які зараз выключаны з партыі), у якой праводзілася вусім сьвядомая лінія на актыўную абарону кулацкіх і нават былых абшарніцкіх гаспадарак, прычым, ня гледзячы на пратэсты беднаты і партыйных арганізацый, з боку Прышчэпава гэтая дзейнасьць атрымоўвала сыстэматычнае падтрыманьне, дзеля чаго ён нават дапушчаў увядзеньне ў заблуду кіраўнічых органаў. Напрыклад: справа былога абшарніка Канькова, ня гледзячы на пратэст Віцебскіх парторганаў, вырашана была ў інтарэсах абшарнікаў з прычыны няправільнай інфармацыі Наркома і старшыні АКВК Лабаноўскага, справа Гаховіча, Вайцэхоўскага і інш. Апартуністычная лінія і скажэньне клясавай лініі ў зямельнай палітыцы Прышчэпавым праводзілася ня гледзячы на шэраг пастаноў ЦКК КП(б)Б і пасьля XV зьезду партыі; па папярэджаньнях ЦКК РСІ, друку і грамадзкасьці аб асобных скажэньнях у зямельнай палітыцы ім ня толькі ня прымаліся меры да выпраўленьня дзейнасьці зямельных органаў і барацьбы са скажэньнямі палітыкі партыі, а, наадварот, ён усялякімі спосабамі абараняў кулацкую лінію НКЗ і, у прыватнасьці, пасьля выкрыцьця злачынна-кулацкай дзейнасьці б. старшыні АКВК Лабаноўскага Прышчэпаў ніякіх мер з свайго боку ня прыняў для выкананьня пастановы ЦКК РСІ і не адмежаваўся ад праваўклапісцкай лініі выключанага з партыі Лабаноўскага, чым бясспрэчна праявіў салідарнасьць з праваўкланісцкімі выступленьнямі апошняга.

Пасьля поўнага выкрыцьця праваапартуністычнай палітыкі НКЗ з боку ЦКК РСІ і ЦК КП(б)Б Прышчэпаў працягваў настайваць на правільнасьці правадзімай ім лініі, хлусьліва спасылаючыся на нібы-та маючыяся дырэктывы КП(б)Б, і ня правільна істалкоўваючы пастановы 3 зьезду Саветаў СССР. Асабіста Прышчэпавым было дапушчана таксама шэраг грубейшых парушэньняў у зямельнай палітыцы, што выказалася, напр., у наступным: у дэнацыяналізацыі савгасу, перадачы яго ў карыстаньне былому абшарніку Марозу і ў настойлівым падтрыманьні гэтай кулацкай гаспадаркі шляхам вызваленьня ад падатку, хадайніцтва ў 1928 г. аб вызваленьні ад самаабкаданьня і ў дачы дырэктывы аб водпуску гэтай гаспадарцы значнага крэдыту, пры гэтым з боку НКЗ вялася барацьба супроць мерапрыемстваў РСІ аб ліквідацыі гэтай гаспадаркі; пратэкцыянісцкі Прышчэпавым падтрымліваўся лжэкалгас „Піанэр", які быў арганізаваны яго знаёмымі, шляхам выдачы дзяржмаемасьці ва ўласнасьць па значна паніжанай ацэнцы, ня гледзячы на цэлы шэраг пастаноў Полацкіх органаў і выкрываючыя артыкулы ў друку, ігнаруючы грамадзкую думку. Прышчэпаў правёў праз АКВК пастанову, накіраваную супроць асноўных прынцыпаў калектывізацыі, пакінуўшы за лжэкалгасьнікамі і ў тым ліку за былымі арандатарамі абшарніцкага маёнтку права на індывідуальнае карыстаньне, чым парушыў закон ЦВК і СНК СССР ад 16-III 1927 г. і адведныя законы БССР; дапусьціў грубейшае правышэньне ўлады і асноўных законаў СССР у тым, што зрабіў самаўладна падарунак зямельнага вучастку і сядзібы былому працаўніку НКЗ пад выглядам узнагароды за навуковыя заслугі; дапушчаў адкрыта кулацкія выступленьні на беспартыйных нарадах, напр., у канцы 1927 г. на нарадзе мэліаратараў ён выступіў з абаснаваньнем шкоднасьці грамадзкіх і калектыўных форм карыстаньня мэліарацыйнымі фондамі, высунуў прапанову аб падзеле іх у надворнае хутарское карыстаньне з арганізацыяй на калёнізацыйным фондзе буйных кулацкіх фэрм. Апошняя прапанова НКЗ Прышчэпава была фактычна праведзена ў прыватнасьці ў пляне будаўніцтва калфонду „Мар'іна", у якім прадугледжвалася ўжо ў 1928 г., г. зн. пасьля 15 зьезду, утварэньне на плошчы да 35 проц. індывідуальна - хутарскіх гаспадарак, якая супярэчна лініі партыі палітыка НКЗ была выкрыта і спынена ў выніку расьсьледваньня ЦКК РСІ.

Акрамя гэткіх цяжкіх абвінавачваньняў у анты-партыйных паводзінах, Прышчэпаў абвінавачваецца таксама і ў тым, што ён на працягу прабываньня ў партыі скрыў ад партыі сваю прыналежнасьць да партыі эсэраў і актыўную дзейнасьць у ёй, даючы ў партыйных дакумантах блытаныя паказаньні; між тым расьсьледваньнем ЦКК устаноўлена, што ён быў актыўным эсэрам і ў 1918 г. у г. Сянно прымаў актыўны ўдзел у антысавецкай дзейнасьці эсэраўскай арганізацыі і нават падпадаў рэпрэсіям. У партыйных дакумантах сваю варожую савецкай уладзе і партыі мінулую дзейнасьць паказваў, як працу ў бальшавіцкай партыі Чырвонай гвардыі. Пасьля ўступленьня ў КП(б)Б падтрымліваў сувязь з чужым элемэнтам і былымі эсэрамі, праводзячы пратэкцыянізм і скарыстаньне службовага становішча ў карысьць былога абшарніка Пішэсецкага і родзічаў сваёй сям'і, таксама клясава-чужых элемэнтаў.

У адносінах да партыйцыцця Прышчэпаў дапушчаў сыстэматычны адрыў ад парт'ячэйкі і ненаведваньне партсходаў, ігнараваў ячэйку НКЗ і ў апараце склаў умовы дзеля важыму самакрытыкі, разьвіцьця падхалімства і інш. балючых зьявішчаў, якія высьветлены абсьледваньнем ячэйкі НКЗ з боку ЦКК у канцы 1928 г.; дапушчаў неэтычныя ўчынкі, у прыватнасьці, у нецьвярозым выглядзе зьяўляўся ў установе, які факт быў высьветлены ў часе 12 зьезду КП(б)Б у зьвязку з адводам яго са складу ЦК КП(б)Б.

На падставе вышэйпаказанага прэзыдыум і парткалегія ЦКК КП(б)Б **пастанаўляюць:**

За праваапартуністычную дзейнасьць і сыстэматычнае скажэньне клясавай лініі ў кіраўніцтве зямельнымі органамі і як выказаўшага сябе ідэолёгічна няздольным да ажыцьцяўленьня палітыкі партыі, а таксама за ўкрыцьцё ад партыі свайго палітычнага мінулага, неэтычныя ўчынкі, адрыў ад мас і сувязь з клясавачужымі элемэнтамі—Прышчэпава З. П. выключыць з шэрагаў партыі.

На бабруйскіх манэўрах.

УЗДОЎЖ ПА ЩАШЫ.

Роўная шаша цешыць вочы.

Шмат сотняў сялянскіх фурманак штодня езьдзяць па яе гладкіх каменьнях, ня тоючы ў праці, не надрываючы коняй.

— Добрая шаша,—гавораць сяляне,—гэта ўжо савецкай работы. (Раней па гэтым шляху надта цяжка было езьдзіць і коняй заморыш і сам заморышся, а цяпер—едзь ды пасьвістывай).

Без перапынку рухаюцца чырвонаармейскія часьці ўсіх відаў зброі. Мерна адбівае крок пяхота, цяжка грукае артылерыя, тарахціць кухня, імчыцца кавалерыя. Кожную хвіліну, узьнімаючы пыл, з грукатам пралятаюць матацыклы, аўтамабілі, зрэдка прапаўзаюць грозныя танкі. І над усім гэтым шэры густы пыл ды асеньняе сонца.

Вось едзе вялізарны грузавік. З яго ў самую гушчыню чырвонаармейскіх шэрагаў сыплюцца шырокія аркушы надрукаванай паперы. На ходу ловяць байцы аркушы і ідуць далей.

Што гэта? Адозвы? Лістоўкі?

Не. У грузавіку едзе паходная друкарня газэты „На чеку". І вось сьвежы нумар газэты пападае іх чытачом у паходзе.

Месцамі шаша прыбрана прыгожымі аркамі з лёвунгамі, плякатамі. Сяляне бліжэйшых вёсак ставяць гэтыя аркі, вітаюць Чырвоную армію.

На левым баку на невялікай адлегласьці адзін ад аднаго разьмясьціліся часовыя аддзяленьні спажывецкіх таварыстваў. Там, пад паветкаю з фанэры, замест шыльдаў, чырванеюць лёвунгі:

— Усё—для Чырвонай арміі.

У крамах досыць прыгожа разложаны „чырвонаармейскія" тавары: ніткі, голкі, хусткі для носу, садовіна, мыла, прадукты і сьвежыя белыя булкі. Усе тавары дабраякасныя і даступны ў цэнах.

Паміж крамамі таксама на невялікай адлегласьці курсуюць паходныя ларкі мясцовых спажывецкіх таварыстваў. Добра падрыхтавалася мясцовая каапэрацыя да манэўраў Чырвонай арміі.

ПАДАРОЖЖА ЦЁТКІ ТЭРАНЕЎСКАЙ.

Паходзіць яна з вёскі. Яшчэ раніцою пашла ў сяло Б. па муку. І вось зараз сядзіць на краю шашы ў замяшаньні, запыленая. Побач з ёю ляжаць тры невялічкія мяшкі з мукой.

— Чаго гэта вы тут сядзіце, цётка? захварэлі?

— Не-е,—адмоўна качае яна галавой.- -Апамятацца не магу.

— А што з вамі здарылася?—пытаюся я і сядаю разам з ёю.

— Гэткае здарылася, што і ўспомніць страшна. 39 гадоў жыву на сьвеце, а такога яшчэ ня бачыла.

І яна пачынае сваё апавяданьне.

„Хадзіла па муку з дзьвума суседкамі. Ну, прышлі, купілі мукі і ўжо рыхтаваліся ісьці дамоў, глядзімо—пад'ехаў нейкі чырвонаармеец на гэткай чартапхайцы—„тицикле" на іхнаму завецца. Мы здуру да яго: „Падвязі, дзядзенька! А ён паглядзеў на нас ды кажа: Вось клункі вашы падвязу, няхай адна якая-небудзь сядзе са мной, дык і паедзем". Я вазьмі ды сядзь. Як паехалі мы, дык толькі бачу, што вямля на неба лезе ды трашчыць. Але вось прыехалі і сталі. Ну, кажа, цётка, злазь! Мне тут трэба ў бок ехаць. Аглядзелася і бачу, што да дому засталіся ня больш вярсты. Цяпер сяджу і чакаю сваіх, што там засталіся".

Да нас падыходзілі дзьве сялянкі.

— Ці жыва ты Галена?—са сьмехам пытаюцца яны.

— Жыва, але да розуму дайсьці не магу. За 39 гадоў першы раз такое ўбачыла.

— Ну і добра,—лёгка ўздыхаюць сялянкі.—Добрыя цяпер салдаты. Век бы ня езьдзіла, а цяпер давялося.

ВЯЛІКАЕ СЬВЯТА Ў ГОРАДЗЕ.

Сёньня ў рух на шашы ўрэзалася нешта новае, сьвяточнае. Разам з пяхотнымі часьцямі ў напрамку да гораду цягнуцца сялянскія абозы. Вазы ўпрыгожаны чырвонымі сьцягамі і лёзунгамі.

Гэта едуць чырвоныя сялянскія абозы з лішкамі хлеба. Абапал дарог уліваліся на шашу ўсё новыя абозы.

Яны цягнуліся з ўсіх канцоў, з усіх вёсак, ехалі да райвыканкому. Далёка за горадам на спатканьне абозу вышлі рабочыя.

Кароткія прывітаньні, прамовы—і зноў ужо разам уступаюць у горад.

Там, на пляцу, перад будынкам райвыканкому—мітынг. Зноў прывітаньні, зноў прамовы. Вялікае сьвята сёньня ў Р.—сьвята змычкі працоўнага сялянства з Чырвонай арміяй, з пралетарыятам.

На мітынгу выступала шмат сялян, ва ўсіх прамовах чуваць адно пэўнае і цьвёрдае:—Мы заўсёды з вамі.

Няхай жыве Чырвоная армія, рабочая кляса і партыя!

Звыш 200 падвод выстраіліся на пляцу. Звыш 6000 пудоў хлеба прывезьлі сяляне ў падарунак Чырвонай арміі.

— Вучэцеся перамагаць,—кажуць яны чырвонаармейцам,—а мы вам дапаможам, бо вашы манэўры—нашы манэўры, ваша вучоба—наша вучоба, бо і вы і мы—адно цэлае, моцнае і непарыўнае.

Г. Л.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ.

На нараду камуністых навуковых работнікаў, якая скліканецца ў пятніцу 27-га верасьня, а 7-й гадзіне ўвечары ў залі насяджэньняў ЦК КП(б)Б выклікаюцца наступныя т. т.:

З Камвузу: Лур'е, Лойко, Выдра, Бутковіч, Сэрбэнта, Канаплін, Гімельфарб, Данільчык, Горуновіч, Радэцкі, Іодко, Фейгельсон, Вайнштэйн, Ліпкоўскі, Карнейчык, Медзьвецкі, Эпштэйн, Літвін, Амбросенка.

З Акадэміі Навук: т. т. Ігнатоўскі, Бялуга, Казак, Бандарэнка, Шпілеўскі, Шпільтэр, Бобрык, Волобрынскі, Матулайціс.

З Інстытуту С.-Г. імя Леніна: т. т. Чуйко, Протасеня, Бондар, Маргелаў, Вечэр, Васілеўскі, Каськоновіч, Хоцько, Лепскі, Манько.

З Белдзяржунівэрсытэту: т. т. Каранеўскі, Бурштын, Сосіо, Голомза, Бухаркін, Гінзбург, Гохман, Паневіч, Рыўлін, Усьпенскі, Маршак, Слонім, Сакерская, Волжын, Домброўскі, Міхайлаў, Чэрняўскі, Рабіновіч, Пракапчук, Башневіч, Маўневіч, Сцельмашонак, Шапіра, Майзель, Мазэль, Рудзіцкі, Фішэр, Шапавалаў.

АПАД ЦК КП(б)Б.

Прафсаюзы ў „Дзень калектывізацыі і ўраджаю".

Набліжаецца „Дзень калектывізацыі і ўраджаю". Гэта сьвята будзе праводзіцца ўпяршыню, ЦСПСБ даў указаньні цэнтральным і акруговым прафарганізацыям неабходна мабілізаваць увагу шырокіх рабочых мас, распрацаваць шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па ўдзелу кожнага прафсаюзнага калектыву ў правядзеньні сьвята „Дню калектывізацыі і ўраджаю".

Падрыхтоўка да сьвята павінна распачацца зараз-жа, неабходна наладзіць азнаямленьне рабочых з мэтамі, задачамі і значэньнем „Дню калектывізацыі і ўраджаю". Усю гэту працу трэба ўвязваць з агульнымі задачамі калектывізацыі вёскі, папулярызацыяй пяцёхгодкі, уздыму ўраджайнасьці, высьвятляючы таксама ролю пралетарскіх сьвят у барацьбе в рэлігійнымі.

Пабач з гэтым павінна быць зьвернута ўвага на папулярызацыю шэфскай працы і вынікаў яе, узмацняючы шэфтаварыствы і працу іх асабліва ў галіне падрыхтоўцы да сьвята. На прадпрыемствах павінны быць абраны рабочыя брыгады для выезда ў вёскі, каб дапамагчы мясцом у падрыхтоўцы і правядзеньні сьвята „Дню калектывізацыі і ўраджаю",

Прафсаюзныя арганізацыі разам з шэфскімі таварысвамі павінны абмёркаваць пытаньне аб дапамозе падшэфным вёскам і калектывам наладзіць культурнае абслугоўваньне сьвята і культпрацу на зімовы пэрыяд.

Саюзы працаўнікоў асьветы, сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, мэдсанпрацы і савгандслужачых, як маючых шчыльную сувязь з вёскай, павінны загадзя даць паказаньні сваім низавым праф'ячэнкам аб актыўным удзеле ў падрыхтоўцы і правядзеньні сьвята. Праф'ячэйкам гэтых саюзаў трэба падумаць аб удзеле ў арганізацыі выставак, куткоў калектывізацыі і ўраджаю ў хатах-чытальнях, школах; папулярызаваць дасягненьні калгасаў па гэтых выстаўках, на сялянскіх сходах. Трэба таксама наладжваць экскурсіі ў калгасы і савгасы.

Саюз с-гасп і лясных рабочых і будаўнікаў павінны разгарнуць падрыхтоўчую працу сярод сэзоньнікаў і ўцягнуць апошніх ў сьвяткаваньне „Дню калектывізацыі і ўраджаю". Усе прафсаюзныя арганізацыі павінны дапамагчы шэфскім таварыствам і іх ячэйкам наладзіць працу па падрыхтоўцы да сьвята. Канкрэтна дапамога павінна заключацца ў аказаньні са дзейнічаньня ў пасылцы рабочых груп апошніх на вёску, у арганізацыі масавай працы сярод сяброў шэфтаварыстваў, падвесьці вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж заводамі і вёскай.

У „Дзень калектывізацыі і ўраджаю" па рабочых клюбах будуць наладжвацца вечары, на якіх падшэфныя савгасы і калгасы зробяць даклады аб сваёй працы. На гэтых-жа вечарох будуць высьветляцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва і высьветляцца задачы рабочай клясы ў галіне сацыялістычнай перабудовы вёскі.

ХРОНІКА.

У ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЗЕ БССР.

ПРА КРЭДЫТНЫ ПЛЯН КАРОТКАТЭРМІНОВАГА КРЭДЫТАВАНЬНЯ НА 1 КВАРТАЛ 1929-30 ГОДУ.

Крэдытны плян кароткатэрміновага гандлёвага крэдытаваньня на 1 квартал 1929-30 году складзен і зацьверджан ЭКАНА у агульнай суме 65.718 тыс. рублёў, з якой на рэспубліканскую прамысловасьць вызначана 31.705 тыс. рублёў, а ўся астатняя сума 34.013 тыс. рублёў разьмеркавана сярод іншымі галінамі народнае гаспадаркі ў наступным: дзяржгандлю—8.425 тыс. руб., сельгаскаапэрацыі 1.450 тыс. руб., сакпрамкаапэрацыі —5.425 тыс. руб. і г. д.

ХОД БУДАЎНІЦТВА Ў БССР.

Эканамічная Нарада заслухала інфармацыю Будаўнічага Камітэту і ВСНГ аб ходзе будаўніцтва ў БССР. З інфармацыі высьвятлілася, што тэмп пабудовы Унізэрсытэцкага Гарадка і каналізацыі г. Менску настолькі марудны, што маецца пагроза зрыву тэрмінаў сканчэньня гэтых пабудоў.

У зьвязку з гэтым запрапанавана пракурору Рэспублікі ўтварыць расьсьледваньне гэтай справы і вінаватых у зрыве прыцягнуць ад адказнасьці.

АСЫГНАВАНЬНЕ СРОДКАЎ НА АДНАЎЛЕНЬНЕ РАЗБУРАНЫХ НАВАЛЬНІЦАЮ БУДЫНКАЎ У ВОРШЫ.

Для аднаўленьня разбураных навальні цаю будынкаў у Воршы, СНК пастанавіў асыгнаваць Аршанскаму акрвыканкому ў якасьці безваротнай дапамогі 5.000 руб. НК Гандлю даручана адпусьціць 2 тыс. пудоў дахавага жалеза, а Белкамунбанку—выдаць у распараджэньне Аршанскага АВК доўгатэрміновы крэдыт у разьмеры 25.000 руб.

Чырвоны абоз.

У нядзелю, 22 верасьня, сяляне Ратамскага с-с. і інш. прыгарадных вёсак арганізавалі Чырвоны абоз.

Каапэрацыйнаму с ы п н о м у пункту здадзена каля 2000 пудоў хлеба. Абоз складаўся з 100 фурманак.

З мэтаю лепшага збору збожжа для абозаў сяляне в. Ткачына правялі паміж сабой сацыялістычнае спаборніцтва.

Пачаўся прызыў моладзі нараджэньня 1907 г.

Учора на Менскім прызыўным пункце распачалася праца на мэдыцынскаму агляду прызыўнікоў 1907 году нараджэньня. Учора праз камісію праходзілі асобы з сярэдняй і вышэйшай асьветы. З 5-га кастрычніка распачнецца мэдыцынскі агляд іншых прызыўнікоў.

На прызыўным пункце арганізаваны габінэты па хваробах вуха і вачэй.

Арганізаваны таксама чырвоны куток, працуе бібліятэка і ларок Менскага цэрабкопу.

Выплата выхадной дапамогі прызыўнікам.

У Наркампрацы нашаму супрацоўніку паведамілі, што прызыўнікі ў шэрагі Чырвонай арміі пры звальненьні з месца працы павінны атрымоўваць 2-тыднёвую выхадную дапамогу.

Калі рабочыя або служачыя прызнаны няпрыгоднымі да вайсковай службы, ці атрымалі ў прызыўнай камісіі адтэрміноўку, дык яны маюць права на працягу 2-х месяцаў вярнуцца на сваю працу. За час яўкі на прызыўныя вучасткі за прызыўнікамі захоўваецца сярэдні заработак.

Рэарганізацыя вясковых сямігодак у школы сялянскай моладзі.

У бягучым навучальным годзе па БССР рэарганізуецца 8 вясковых сямігодак у школы сялянскай моладзі. У працягу пяцігодкі будуць рэарганізаваны яшчэ 62 вясковыя школы.

Да пераводу прамысловасьці на бесьперапынны тыдзень.

Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі БССР даручыў спэцыяльна вылучанай камісіі распрацаваць шэраг мерапрыемстваў для пераводу рэспубліканскай прамысловасьці на бесперапынны рабочы тыдзень.

Прыбываюць трамвайныя вагоны.

З Масквы ў Менск накіроўваецца 10 трамвайных вагонаў. Завод „Гомза" даў загад тэрмінова перадаць гэтыя вагоны Менскаму трамваю. Першая партыя (5 вагонаў) будзе адпраўлена 25 верасьня, а астатнія 5 вагонаў 10 кастрычніка.

200 аграномаў—у калгасы.

Да „дню калектывізацыі і ўраджаю" падрыхтоўваюцца 200 аграномаў, якія будуць накіраваны на сталую працу ў калгасы і савгасы Беларусі.

„Дзень калектывізацыі і ўраджаю"—на экране.

Белдзяржкіно намячае правесьці шэраг кіноздымкаў правядзеньня „дню ўраджаю і калектывізацыі", дзеля чаго будуць арганізаваны выезды ў буйныя калгасы і вёскі.

Фізкультурныя спатканьні.

Гэтымі днямі на летній спартыўнай пляцоўцы „Прафінтэрн" адбыліся спатканьні. Па гарадкох паміж камандамі Дынамо і МББ. Гульня скончылася з вынікам 2:0 на карысьць Дынамо.

— Спатканьне па баскетболу камаид МББ і савгандслужачых скончылася перамогай савгандслужачых.

Праверка гаспадарча-палітычных дагавораў.

На прадпрыёмствах Гомельскай акругі пачалася масавая праверка выкананьня гаспадарча-палітычных дагавораў, утвораных паміж праводзячымі спаборніцтва прамысловых прадпрыёмстваў. Для ўдзелу ў гэтай важнай рабоце прыцягнуты рабкоры, моладзь, „лёгкія кавалерысты", спэцыялісты. На прадпрыёмствах арганізоўваюцца спэцыяльныя брыгады, часовыя кантрольныя камісіі, якія будуць выяўляць усе дасягненьні і недахопы ў выкананьні дагавораў. Апроч таго, праз даклады гаспадарнікаў на рабочых сходах будуць выяўлены вынікі і што перашкаджае спаборніцтву.

Каб дапамагчы нізавым прафячэйкам у падрыхтоўцы да праверкі і ў правядзеньні самой праверкі АСПС вылучыў да 20 адказных работнікаў, якія прымацаваны да асобных прадпрыёмстваў акругі.

ЦБ пралетстуду—аб выніках прыёму ў БДУ.

ЦБ пралетстуду, абгаварыўшы пытаньне аб выніках прыёму ў БДУ адзначыла, што па некаторых факультэтах кампляктаваньне праведзена не па развёрстцы. Так, на правгас месцы не запоўнены на 16 проц. сялянамі, мала жанчын. На пэдфаку таксама недастатковая колькасьць сялян: на пэдагагічным факультэце—недабор рабочых.

Пленум ЦБ пралетстуду.

11 кастрычніка ў Менску склікаецца чарговы пленум ЦБ пралетстуду. Пленум абгаворыць наступныя пытаньні: аб выкананьні пастаноў ліпнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б), аб сац. спаборніцтве ў навучальных установах, аб матар'яльна-бытавых умоў студэнцтва і інш.

Колькасьць стыпэндыятаў павялічваецца.

У бягучым навучальным годзе колькасьць студэнтаў, забясьпечаных стыпэндыямі ў вышэйшых навучальных установах, павялічваецца на 7 проц. Агульная колькасьць стыпэндыятаў дасягае 52 проц. усіх студэнтаў.

Стыпэндыя павялічваецца да 32 рублёў.

Сацыялістычнае спаборніцтва сярод студэнцтва.

Для больш пасьпяховай і лепшай пастаноўкі навучаньня па факультэтах БДУ пачалося сацыялістычнае спаборніцтва.

Саратаўскі ўнівэрсытэт выклікаў на спаборніцтва правгас БДУ: пэдфак БДУ выклікаў Харкаўскі пэдінстытут.

Спаборніцтва разгортваецца і паміж асобнымі аддзяленьнямі і групамі.

Хто-ж адкажа за зьдзекі?

Полацкая каапэрацыя інвалідаў працавала, маючы на мэце выціснуць прыватны гандаль.

Два шчырыя і сумленныя працаўнікі—партыйцы—Кісялёў і Матус—працавалі нясупынна, але мэты не ажыцьцявілі.

Паміж каапэрацыяй інвалідаў Полацкага ЦРК былі нелады па віне старшыні Полацкага цэрабкопу Крэйніна.

Гэты чалавек вельмі спадабаў прыватнікаў, і з імі ён вёў часта камэрцыйныя справы: купляў каўбасы для цэрабкопу, забараніўшы закупку ў каўбаснай фабрыцы каапэраваньні інвалідаў і г. д. у выніку—каўбасная каапэрацыя інвалідаў зачынілася, і рабочыя Полацку ў дубальт пачалі плаціць за каўбасы, якія дастаўляюць прыватнікі.

На прызыдыуме АВК 6-га сакавіка 1929 году была вылучана камісія для абсьледаваньня каапэрацыі інвалідаў.

Старшыняй камісіі быў вылучан т. Крэйнін, які прыстроіў на працу кулака-хутаранина Цімахова (на пасаду загадчыка дравяным складам), прыстроіў загадчыкам смалакурнага заводу свайго цесьця, які згнаіў некалькі тысяч пудоў каапэрацыйнай бульбы.

Для камісіі на чале з Крэйніным рэвізія аказалася справай зусім „лёгкай", і на наступным пасяджэньні былі прадстаўлены вынікі. Там значылася, што ў каапэрацыі індвалідаў ёсьць растрата ў суме 18.475 рублёў.

АВК перадаў справу пракуратуры і старшыня каапэрацыі Кісялёў разам з намесьнікам Матусам былі зьняты з працы, выключаны з партыі і, урэшце, трапілі ў папраўчы дом.

Восем месяцаў цягнулася сьледзтва, восем месяцаў Кісялёў і Матус прыводзіліся пад вартай да сьледчага і назад і толькі дзякуючы таму, што справа трапіла ў рукі другога сьледчага, яна была паскорана.

Сьледчы заўважыў поўную неабгрунтаванасьць прад'яўленых Кісялёву і Матусу абвінавачаньняў і накіраваўся да старшыні АВК з просьбай адпусьціць сродкі для паўторнай рэвізіі. Старшыня АВК у гэтым адмовіў

Сьледчы, урэшце, дабіўся другой рэвізіі. Прыехаў з Менску з БІКА інструктар, які прадставіў сьледчаму і АВК акт абсьледаваньня, дзе значылася, што няма ніводнай капейкі нястачы і няма ніякай растраты.

Арыштаваных таварышоў вызвалілі з-пад варты і зараз, у выніку „невялічкай" памылкі, калі ня лічыць кампрамэнтацыі 2 таварышоў, і таго, што іх чакала гэтым таварышам трэба заплаціць 2288 рублёў,

Нас цікавіць з усяе гэтае справы наступнае: Хто заплаціць Кісялёву і Матусу 2288 рублёў? Хто адкажа за зьдзекі над невінаватымі людзьмі? Хто-ж, урэшце, займе лаўку падсудных, на якую хацелі пасадзіць двух сумленных таварышоў, скампрамэтаваўшы іх у вачох працоўнага насельніцтвах Полацкай акругі. Хто адкажа за ўсё гэта?..

Ул. Паскрэбка.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 24-е ВЕРАСЬНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад
1 6 проц. выйгр. паз.	4.92,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	127.00	129 00
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.05	100.45
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.35	25.45
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.04,5	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.39	10.74
1 выйг. паз. інцустр. 27 г.	25.83	25.93
2 „ „ „ проц.	25.23	25.33
2 „ „ „ 6-проц.	25.23	25.33
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	100.68	100.73
12 проц. рэнтная пазыка 1927 г.	103.76	—

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— З 24-IX па 6-X з 7-мі гадзін увечары будзе праводзіцца чыстка ячэйкі КП(б)Б Працасьветы.

Склад Праверкому:

КЕНЕНГ—дырэктар Хлебазаводу,

ШКІРЫЧ—рабочы заводу „Бальшавік" і

ЯКАЎЛЕЎ—сэкратар ячэйкі КП(б)Б Белпэдтэхнікуму.

У каго ёсьць матар'ялы на членаў і кандыдатаў партыі гэтай ячэйкі просьба здаваць членам камісіі, або апускаць у скрынку скарг Дому Асьветы.

На сход запрашаюцца ўсе асьветнікі і працоўныя—бацькі вучняў.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

КІНО

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР".	Ад панядзелка 23-га верасьня **Канец Санкт-Пецярбургу.** У 7 ЧАСТКАХ. Рэжысер ПУДОЎНІК. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дню. Пачатак 1-га сэаноу а 3 гадз. 30 хв., 2-га а 5 гадз. ПА НЯДЗЕЛЯХ каса адчынена ад 12 гадз. дню Цана білету 10 кап.
КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".	Ад панядзелка 23 верасьня. **ЖЫВЫ ТРУП** па драме Л. ТАЛСТОГА. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Ад панядзелка 23-га верасьня. З амэр. камэд. у адзін сэанс. 1. ЯНА ГЭТА ЁН у 3 частках. 2. ЦЁМНЫ КАНЁК у 2-х частках. 3. ЦІХАЯ СЯМЕЙКА у 3 частках. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ	АД ПАНЯДЗЕЛКА, 23-га ВЕРАСЬНЯ. Адна з лепшых карцін сусьветнай кіноматаграфіі. **ЧАНГ. (Жахі джунгляў).** Пачатак 1 сэансу з 7 гадз. Каса ад 6 гадз.

Белар. Дзярж. сан.-гігіен. і-тут НК Ах. Здароўя

)— абвяшчае —(

КОНКУРС на ЗАМЯШЧЭНЬНЕ ніжэйпамянёных ПАСАД з 1-X 1929 году.

1. Загад. сан.-тэхнічн. аддзял. (аклад—130 р. у месяц), жадана ўрача—знаёмага з пытаньнямі санітарнай тэхнікі і камунальн. упарадкаваньня з пацігадав. отажам і навуковымі працамі.
2. Загадч. аддз. прамысловай санітары (аклад—105 р. у месяц), жадана ўрача, тэорытычна і практычна знаёмага з пытаньнямі прамысловай санітары з пацігадав. стажам.
3. Асыстэнта па грамадзкаму харчаваньню (акл.—95 р. у месяц), жадана ўрача грамадазнаўцу знаёмага з нарміраваньнем харчаваньня з 2-хгадовым отажам.
4. Асыстэнта аддз. пр